ПАГОНЯ

Чацвер
19 жніўня 1999 г.
№ 51 (428)
Кошт 25.000 руб.

«Аль-Кітаб» гуртуе моладзь

З'езд татарскай моладзі Беларусі прайшоў у мінулыя выхадныя ў Слоніме. Як паведаміў старшыня Слонімскай арганізацыі Беларускага аб'яднання татар-мусульман «Аль-Кітаб» Сулейман Байрашэўскі, у ім узялі ўдзел каля 150 прадстаўнікоў татарскіх абшчын з 13 гарадоў Беларусі і госці з Літвы. Спонсарам з'езду выступіла беларускае аддзяленне расейскай нафтавай кампаніі «Лукойл».

На канферэнцыі, якая прайшла ў межах з'езду, выступілі старшыня мусульманскай рэлігійнай абшчыны Менска Ібрагім Канапацкі, член муфтыяту татар Беларусі Ісмаіл Варановіч і кіраўнік маладзёжнай арганізацыі татар-мусульман Беларусі Барыс Радкевіч. Прамоўцы асвятлілі гісторыю канфесійных традыцый Слоніма і Беларусі, а таксама ролю татарскай моладзі ў захаванні веры продкаў. Сярод удзельнікаў з'езду было праведзена сацыялагічнае даследаванне па вывучэнню запытаў татарскай моладзі, конкурс па гісторыі, традыцыях і татарскай мове. Свята завяршылася вечарам дружбы.

Рабочай камісіі на чале з Б.Радкевічам даручана распрацаваць праграму дзейнасці маладзёжнай арганізацыі татар-мусульман краіны. Удзельнікі з'езду выказалі абурэнне актам вандалізму —апаганеннем Слонімскай мячэці, якое адбылося ўвечары 9 жніўня. Як паведамляла ПАГОНЯ, хуліганы ўчынілі пагром, спрабуючы пранікнуць унутр мячэці, якая была адноўлена пры падтрымцы мецэнатаў з арабскіх краін і Турцыі ў 1994 годзе і стала першым рэлігійным цэнтрам іслама, адроджаным у Беларусі пасля 60-гадовага перапынку.

Марат Гаравы

Дварцовыя разборкі

У вёсцы Дварэц Дзятлаўскага раёна жылі-былі дзве сям'і армянскіх перасяленцаў. Нехта скраў у іх тры мяхі зерня: падазравалі мясцовых лайдакоў. 12 жніўня ў госці да названых сем'яў прыехалі стрыечныя браты П. з Маскоўскай і Калужскай абласцей. Пачуўшы пра крадзеж, яны ўзялі ў барот двух падазроных. Першы абышоўся лёгкім перапудам. Другога звязалі, завезлі за вёску і закапалі, але ён не прызнаўся.

Праз два дні ўдзельнікі разборкі былі затрыманыя міліцыяй па заяве пацярпелага. Узбуджана крымінальная справа паводле артыкула за пагрозу забойства.

Стралялі, як лепей...

А палове дзесятай увечары 14 жніўня ля пад'езду дома нумар 58 па вуліцы Урублеўскага ў Гродне прагучала шэсць стрэлаў. Нарад міліцыі спыняў жыхара названага дома, які перад гэтым быў прыцягнуты да адказнасці за сямейны скандал са сваімі бацькамі. Падчас «пасадкі» ў машыну правапарушальнік ударыў міліцыянта, спрабаваў завалодаць зброяй, а потым кінуўся наўцёкі.

Чатыры стрэлы былі ў паветра, два патрапілі ў левую нагу ўцекача. Адна з куляў заляцела праз шыбы ў кватэру на першым паверсе. Паводле папярэдніх звестак, гэта быў рыкашэт ад бардзюра.

Пасля аказання медычнай дапамогі паранены быў адпушчаны дахаты.

Сяргей Самасей



20 і 21 жніўня - пераменная воблачнасць, кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднёва-заходні, 3-8 м/с. Тэмпература паветра ўначы +7...+12, удзень +17...+22.

У Астраўцы ўлада ўмацоўваецца за кошт крымінальных аўтарытэтаў?

У Астравецкім раёне і раней было нямала «цікавых», а часам і цяжка вытлумачальных кадравых перастановаў. Але тое, што адбываецца ў гэтым раёне апошнім часам, ужо не толькі нельга зразумець, але, на мой погляд, ні ў якія рамкі не ўкладваецца і каментару не падлягае. Магутная мясцовая прэзідэнцкая вертыкаль, упэўненая ў сваёй непаграшымасці і самавольстве, на дзве кіруючыя пасады ў раёне прызначыла дзвух даволі «цікавых» асобаў, якія, мякка кажучы, мелі сур'ёзныя непаразуменні з крымінальным кодэксам.

Месяц-паўтара таму на пасаду загадчыка лабараторыі аграхіміі ў Астравецкім раёне быў прызначаны нядаўна вернуты з месцаў не зусім аддаленых сп. М.Ялоўскі. Ён адбываў там пакаранне, прызначанае яму судом па артыкулу 91 ч.3 (крадзеж маёмасці ў буйных памерах) і арт.191 ч.1 (крадзеж і знішчэнне дакументаў фінанса-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства падманным шляхам). Цікава, што грамадзяне, якія былі асуджаны па першаму артыкулу, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, не маюць права ад 2 да 5 гадоў займаць адпаведныя кіруючыя пасады. Аднак для Ялоўскага чамусьці было зроблена выключэнне. І, безумоўна, не выпадкова.

Перад сённяшняй уладай М.Ялоўскі ў Астравецкім раёне чалавек заслужаны - не пацягнуў у свой час па сваёй справе нікога з тых, хто будаваў пад яго ў раёне нешта накшталт піраміды з шэрагу камерцыйных структураў. Неўзабаве структуры тыя лопнулі, чым учынілі вялізную шкоду дзяржаўным прадпрыемствам і калгасам, якія ў свой час разам з прыватнымі асобамі былі іх заснавальнікамі.

Выключэнне Ялоўскаму было зроблена яшчэ і таму, што ён адзін з найбольш яркіх прадстаўнікоў камуна-наменклатурнага «залатога кадравага запасу» Астравецкага раёна. У мінулым М.Ялоўскі не толькі хваціў камерсант, вышэшчаны раённай уладай, але яшчэ і быў сакратар райкама партыі па ідэалогіі. Той самай партыі, якая ў свой час была «умом, честью и совестью нашей эпохи».

Зусім нядаўна яшчэ адзін прадстаўнік астравецкага «залатога кадравага запасу» заняў пасаду кіраўніка. Былы старшыня калгаса імя К.Маркса Я.Кухарчык, які замест «светлага будучага» ледзь не давёў сваіх былых калгаснікаў да жабрацкай торбы (месяцамі не выплочваў ні заробку, ні нават дзяржаўных выдаткаў па дзяцей), стаў кіраўніком раённага дзяржстраху. Трэба заўважыць, што гэты былы - цяперашні кіраўнік, не так даўно праходзіў у судзе па крымінальнай справе па арт. 91 ч.І (крадзеж маёмасці) і атрымаў пакаранне. Праўда, вельмі ўжо памяркоўнае - два гады папраўчых работ з вылічэннем 20% заробку ў даход дзяржавы. І вось Я.Кухарчык зноў у кіруючым крэсле.

Цікава, што гэты «непатапляльны кіраўнік» праслявіўся і па яшчэ адной крымінальнай справе. Звязана яна была з кантрабандай праз літоўска-беларускую мяжу вялікай партыі зерня і жывёлы. Але гэтую крымінальную справу, якую на заключным этапе расследава-ла КГБ, улады закрылі. Матывуючы гэта туманнай фармулёўкай «у сувязі са зменай абставінаў».

Паказальным з'яўляецца яшчэ і тое, што расследаванне па гэтай крымінальнай справе праводзілася амаль адначасова з так званай гучнай справай Паўла Шарамета. Апошні толькі за тое, што паказаў праўдзівы тэлевізійны рэпартаж з літоўска-беларускай мяжы адседзеў больш як два месяцы ў следчым ізалятары і атрымаў два гады зняволення ўмоўна. У першым жа выпадку за непараўнальна больш цяжкае, учыненае Я.Кухарчыкам злачынства (кантрабанду), з галавы былога старшыні калгаса не ўпаў ні адзін ягоны сівы волас. І нашыя ўлады яшчэ кажуць, што ўсе роўныя перад законам?

Аднак адну выснову можна зрабіць упэўнена. Астравецкая ўлада «ўмацавалася» двума безумоўнымі яе аўтарытэтамі, якія, трэба меркаваць, не толькі яе «ўмацуюць», але і нададуць ёй больш красамоўнае аблічча і такую вельмі сёння модную крымінальную рэспектабельнасць. Для галоўнага раённага вертыкальшчыка М. Кудыркі і гарадзенскага ваяводы А.Дубко ў гэтым няма аніякага сумневу. А інакш, як разумець тое, што адзін прызначыў такія кадры, а другі даў згоду на падобныя кадравыя прызначэнні?

Мікола Уласевіч

Дапаможам адзін аднаму

15 жніўня ў Гродне ў гарадскім парку імя Жылібера прайшла дабрачынная акцыя, арганізаваная прафсаюзам прадпрымальнікаў і асобаў, якія працуюць па найму, на рынку «Паўднёвы». Дзецям з маламаёмасных сем'яў раздаваліся шарыкі, цукеркі, марожанае, бясплатныя білеты на каруселі. У гэты ж дзень зранку падобная акцыя адбылася непасрэдна на рынку «Паўднёвы». Акрамя таго, за перыяд з 7 па 15 жніўня дзякуючы акцыі «Наш горад» - а менавіта так называецца гэтае мерапрыемства - болей за 30 мнагадзетных і маламаёмасных сем'яў атрымалі адзенне.

Паводле словаў аднаго з арганізатараў дабрачыннага мерапрыемства Валерыя Леванеўскага, сярод асноўных мэтаў гэтай акцыі - змяненне памылковага ўяўлення некаторых грамадзянаў, якія лічаць прадпрымальнікаў «жулікамі» і «хапугамі». Для прадпрымальнікаў, якія ўдзельнічалі ў акцыі, быў устаноўлены мэтавы ўзнос у памеры 200 000 рублёў з чалавека. Грошы пайшлі на закупку паветраных шарыкаў, цукерак і аплату атракцыёнаў для дзяцей. Падчас акцыі ўсім жадаючым прапаноўвалася здаваць у прафсаюз падтрыманыя, а таксама непатрэбныя новыя рэчы, канцтавары, цацкі, камп'ютэры, электратавары і многае іншае. Усё гэта надалей будзе раздадзена малазабяспечаным грамадзянам, а таксама перададзена ў школы і дзіцячыя дамы.

Учора пачаўся чарговы этап акцыі «Наш горад». У старым корпусе тонкасуконнага камбіната адбылася раздача сабраных рэчаў працоўным.

Ася Куніцкая

Памяці Ларысы Геніюш

Больш за 50 прыхільнікаў творчасці беларускай паэткі Ларысы Геніюш, якая памёрла ў 1983 годзе, адзначылі днямі ў пасёлку Зэльва чарговую гадавіну яе смерці. Праваслаўны і каталіцкі святары адслужылі імшу. Над магілай Геніюш лунаў бел-чырвона-белы сцяг, гучалі ўспаміны пра Ларысу Антонаўну, яе няпросты жыццёвы шлях — яна, як вядома, так і не прыняла савецкага грамадзянства.

Вершы Ларысы Геніюш, якія сталі нацыянальным здабыткам, і яе біяграфія сёлета выключаны са школьных праграмаў, як і паэзія Масея Сяднёва — таксама вязня сталінскіх лагераў. Напачатку 90-х гадоў шмат гаварылася аб стварэнні ў Зэльве дома-музея Ларысы Геніюш, аднак сёння хаціна, дзе жыла паэтка, непазнавальна перароблена новымі гаспадарамі.

Антон Лабовіч

І нічога табе, Алесь, за гэта не будзе! Ні каня, ні шашкі, ні «денежного довольствия»...

Крымінальная справа, выкліканая з'яўленнем брашуры «У Пагоню» з карыкатурамі гарадзенскага мастака Алеся Сурава, заведзеная пракуратурай Ленінскага раёна г.Гродна, закрыта за недастатковасцю доказаў (адбылося гэта 2 ліпеня гэтага года). Аднак спыненне пераследу мастака па лініі УУС не стала падставай для спынення пераследу па лініі абласной «вертыкалі». Чыноўнікі ад культуры робяць усё, каб пазбавіць яго майстэрні.

З 1995 года, пасля адпаведнага рашэння гарвыканкама, усе гарадзенскія мастакі аплочваюць арэнду сваіх майстэрняў па тарыфах кватэрнай платы. Так робіцца ва ўсім цывілізаваным свеце. І гэта справядліва, асабліва, калі ў дзяржавы няма іншых магчымасцяў падтрымаць дзеячоў культуры. Штогод дамовы на арэнду творчых майстэрняў пераафармляюцца. Пры гэтым звяраюцца спісы мастакоў (бо нехта выбывае ці мяняе адрас). Спісы, падрыхтаваныя ў гарвыканкаме, падаюцца ў аблвыканкам на зацверджанне. На гэтай стадыі ў гэтым годзе і было выкрэслена прозвішча Сурава. Рашэнне Абласной камісіі па ўпарадкаванню выкарыстання адміністратыўных будынкаў, узначальваемая намеснікам старшыні аблвыканкама М.А.Бяляевым, вынесена ў траўні, якраз у перыяд следства па вядомай справе «об оскорблении чести и достоинства президента».

Хадайніцтва дырэктара Тэатра лялек, дзе Сураў працуе галоўным мастаком, перад начальнікам упраўлення Культуры Гарадзенскага аблвыканкама Л.І. Кадзевіч аб садзейнічанні ў рашэнні дадзенага пытання на карысць мастака вынікаў не дало. «Позна» - рэзюмавала на атрыманым лісце спадарыня Кадзевіч. Наступнае хадайніцтва накіравана непасрэдна на імя М.А.Бяляева. Адказу пакуль няма, хаця ліст зарэгістраваны яшчэ 21-м чэрвеня.

Тым часам быў уключаны механізм рэалізацыі рашэння Камісіі. У пачатку Алесь атрымаў новы разлік аплаты арэнды. Цяпер за майстэрню, агульная плошча якой (разам з калідорам і прыбіральняй) крыху больш за 50 квадратных метраў, яму трэба будзе выплочваць штомесяц суму, эквівалентную 102 далярам ЗША. Гэта ў дзесяць раз больш, чым раней. Потым пайшлі лісты. «Прапануем Вам у трохдзённы тэрмін звярнуцца ў гарвыканкам з заявай аб добраахвотным скасаванні Дамовы (аб арэндзе. - **Рэд.**) і адмове ад займанага памяшкання», - напісаў начальнік ЖЭС-11 спадар Яскевіч мастаку Сураву 13 ліпеня. Пасля таго, як Алесь не здаўся ў добраахвотным парадку, ён атрымаў яшчэ адно пасланне ўжо за подпісам в.а. начальніка ЖРЭУ сп. Ціханава. Той прапанаваў здаць памяшканне на працягу сямі дзён і прыгразіў судом. Тэрмін «последнего китайского предупреждения» скончыўся 14 жніўня. Афіцыйныя органы дагэтуль не зрабілі ніякай спробы выразна патлумачыць, на падставе чаго таленавітаму мастаку адмоўлена ў правах, якімі надзелены ўсе астатнія яго калегі.

Ніна Палуцкая

Беларускі Фронт - беларуская палітыка

Трэба выразна разумець, што калі ў Беларусі ня будзе моцнай палітычнай арганізацыі, заснаванай на нацыянальнай ідэі, - палітычнай будучыні ў нацыі няма.

Такой арганізацыяй быў і ёсьць яшчэ на сёньня Беларускі Народны Фронт.

Беларускае грамадзтва

Сілай, якая супрацьстаяла беларускаму нацыянальна-вызвольнаму руху і адраджэньню Беларусі напрацягу 200 гадоў расейскай акупацыі, была расейская імпэрская адміністрацыя і прарасейскае чынавенства (куды ўваходзіла яшчэ руская праваслаўная царка і рускі друк).

За саветамі - гэта савецкая прамаскоўская адміністрацыя і партыйная намэнклятура. Зараз - былая савецкая адміністрацыя і былая прамаскоўская намэнклятура.

Уладзімер Старчанка прапанаваў (у артыкуле «Што адбылося на Беларусі») называць гэтую антыбеларускую сілу адзіным тэрмінам - «каляніяльная адміністрацыя», бо гэтая зьява тыпалягічная для ўсіх імпэрыяў у пэрыяд развалу, калі яны імкнуцца захаваць свой уплыў на вольных тэрыторыях.

У Беларусі з рэжымам «каляніяльнай адміністрацыі» змагаюцца беларускія нацыянальнасьвядомыя людзі, якія хочуць незалежнай, вольнай беларускай нацыянальнай дзяржавы, дзе будзе беларуская ўлада, беларуская адміністрацыя і беларуская культура. Палітычна актыўная частка гэтых людзей аб'ядная ў Беларускі Народны Фронт ды ў іншыя арганізацыі, якія стаяць на грунце беларускай нацыянальнай ідэі.

Зь сёньняшнім дыктатарскім рэжымам каляніяльнай адміністрацыі ў Беларусі змагаецца таксама намэнклятурная апазыцыя (ці «каляніяльная апазыцыя», па клясыфікацыі Ул.Старчанкі). Гэта выхадцы, у асноўным, зь дзяржаўнай адміністрацыі, якія апынуліся за бортам улады. Яны хочуць вярнуцца ва ўладу, прыстасаваўшы яе пад сябе, і пры гэтым імкнуцца абаперціся на Маскву і на Беларускі Вызвольны Рух.

Паміж нацыянальна-вызвольнай і каляніяльнай (намэнклятурнай) апазыцыямі ідзе змаганьне за ўплывы. Нацыянальна-вызвольная апазыцыя імкнецца прышчапіць намэнклятурным апазыцыянерам нацыянальна-вызвольныя каштоўнасьці, уплываць на фармаваньне іхняе нацыянальнае сьвядомасьці і схіліць на грунт беларускай нацыянальнай ідэі.

Намэнклятурная апазыцыя імкнецца скарыстаць нацыянальна-вызвольны рух у сваіх інтарэсах, падкрэсьлівае, што галоўнае ёсьць адзінства «дэмакратычных сілаў» супраць дыктатуры і ліквідацыя рэжыму, пазьбягае гаварыць пра прынцыпы, пра зьмест «дэмакратычных сілаў» і пра тое, што будзе потым.

Змаганьне за ўплывы спрыяла збліжэньню да нацыянальных каштоўнасьцяў і да беларускай нацыянальнай ідэі некаторых намэнклятурных апазыцыянэраў, і наадварот - да пераходу на канфармісцкія пазыцыі часткі кіраўніцтва Беларускага Народнага Фронту. Было падважана цьвёрдае правіла ў палітыцы: супрацоўнічаць па інтарэсах і разьмяжоўвацца па прынцыпах. Канфармізм прывёў да крызісу ў БНФ.

Зянон Пазьняк

Працяг на стар. 5

На апошняй мяжы...

Калі ўлетку 1994 года Аляксандр Лукашэнка прымаў краіну - гэта была тыповая постСССРаўская рэспубліка, якая вельмі пасьпяхова будавала знешнія атрыбуты незалежнасці, і чакала радыкальнай эканамічнай рэформы. Прайшоў тэрмін, на які абіралі прэзідэнта. Сёння Беларусь уяўляе адасобленую тэрыторыю амаль без кантактаў са знешнім светам, з рэжымам паліцэйскага кіравання ва ўсіх галінах дзейнасці і самазабойчай эканомікай валюнтарысцкага сацыялізму. Краіна мэтанакіравана і паслядоўна пазбываецца грунту, на якім трымалася яе незалежнасць.

За ўсе пяць гадоў дзяржава нават не сфармулявала свайго знешнепалітычнага інтарэсу. На што прэтэндуем, чаго просім, што прапануем узамен і каму - нічога гэтага Еўропа не пачула. Усю знешнюю палітыку замяняе барацьба за галоўнае дзяржаўнае крэсла ў Расіі, гэтак званая інтэграцыя. Час ад часу кіраўніцтва краіны рабіла замежныя вояжы ў слабаразвітыя краіны Блізкага і развітыя Далёкага Усходу, папярэдне пратрубіўшы пра заключэнне астранамічных кантрактаў, але практычна ніхто не спакусіўся на іхнія прапановы. Замест таго, каб прадстаўляць сваю краіну на знешнепалітычнай арэне, вышэйшая службовая асоба Беларусі гойсае па расейскай глыбінцы на манер каміваяжора, спрабуючы ўперці тамтэйшым абарыгенам залежалы тавар са скідкай.

Каб хоць неяк зафіксаваць сваю прысутнасць у міжнародным жыцці, час ад часу робіцца крыклівыя заявы з нагоды якіх-небудзь спрэчных і гарачых пытанняў: па праблеме Косава, правах былых камуністаў у Прыбалтыцы альбо проста пра замахі ЦРУ на «сінявокую рэспубліку». Паталагічная нянавісць да NATO і каштоўнасцяў заходняй цывілізацыі, каналізацыйная вайна за амбасадарамі за стратэгічны населены пункт Драздыдзе не толькі безнадзейна сапсавалі дачыненні з Еўропай і Злучанымі Штатамі, але рэальна прывялі да міжнароднай ізаляцыі Беларусі. Дайшло да таго, што чыноўнікаў беларускага ўрада, нібыта нейкіх нелегальных мігрантаў ці крымінальнікаў, сталі не пускаць да сябе краіны Захада. «Мы нікому там не патрэбныя», - вяшчаюць майстры прапаганды і палкоўнікі дэзінфармацыі. Гэта ісцінная праўда - яны там нікому не патрэбныя.

Замест таго, каб праводзіць эканамічную рэформу, якая была падрыхтаваная папярэднімі дзеяннямі ўрада Кебіча і законамі, прынятымі Вярхоўным Саветам, першы прэзідэнт пачаў узнаўляць камандна-адміністратыўнае кіраванне эканомікай. У выніку была цалкам знішчана фінансавая сістэма краіны, грошы больш не выступаюць сродкам плацяжу, а вытворчасць любой прадукцыі не вядзе да росту заробкай платы, даходаў насельніцтва і дзяржавы. У сельскай гаспадарцы поўны занядпад, бо паводле палітычных меркаванняў захоўваецца прымітыўная сістэма прыгоннай працы ў калгасах. Актуальным стала пытанне харчовай бяспекі краіны. Урад афіцыйна адмовіўся ад выкарыстання ў беларускай эканоміцы ўласных грошай. Гэты крок вядзе толькі ў адзін бок - страціўшы рычагі фінансавага ўплыву на нацыянальную эканоміку, беларускі ўрад непазбежна страціць і палітычны кантроль за эканомікай. Усё нацыянальнае багацце: заводы, нетры, прыродныя рэсурсы пяройдуць пад кантроль расейскіх алігархаў і крымінальнага капіталу. Палітычная надбудова ў выглядзе ўрада, «палатаў», «вертыкалі» і самога «боса» ператворыцца ў дэкарацыю для спектакля, сцэнар якога будзе пісацца недзе «далёка на Усходзе». Гэта будзе тыповы сцэнар рабавання каланізатарамі захопленых тэрыторыяў. Тым часам, прэзідэнт перайшоў на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне: калі ўсё насельніцтва ледзьве зводзіць канцы з канцамі, ён устроіў сабе натуральны камунізм.

Зрэшты, пра «боса». Гэта ж трэба было злачыцца, каб нават не здолець аформіць працяг прэзідэнцкіх паўнамоцтваў большменш доказальна з юрыдычнага пункту гледжання. У выніку вядучыя краіны свету ўжо заявілі пра страту легітымнасці прэзідэнтам Беларусі. Значныя палітычныя фігуры Расіі, напрыклад Яўлінскі, адназначна заяўляюць пра тое, што не будуць падпісваць дагаворы з асобай, якая больш не прадстаўляе беларускую дзяржаву і народ Беларусі. У выпадку неабходнасці гэтую пазіцыю могуць заняць прэзідэнт Расіі ці яе Дума - нагодай можа быць любы рэзкі крок А.Лукашэнкі ў накірунку барацьбы за пасаду кіраўніка Расіі. Такім чынам, беларускі лідар трапляе ў залежнасць ад любога патрабавання суседняй дзяржавы.

Усё больш паглыбляецца палітычны крызіс унутры краіны. Сумнеў у легітымнасці вышэйшай улады - невераготдна спрыяльная глеба для змоваў, пераваротаў, сепаратызму і актывізацыі на нашай тэрыторыі дзейнасці спецслужбаў суседніх дзяржаваў. Адна фраза спікера С.Шарэцкага - пра тое, што ён паводле Канстытуцыі пераймае ўладу - выводзіць крызіс на новую ступень. Добра, што спікер нерашучы і не карыстаецца падтрымкай. Але спікера можна замяніць, і як меней адзін кандыдат ужо ў наяўнасці. Сітуацыя спрыяе таксама махлярству ўсялякіх авантурыстаў, махінацыям у бізнесе, карупцыі. У сферы духоўнага жыцця хуткімі тэмпамі развіваюцца нявер'е ў грамадскія інстытуты, п'янства, наркаманія, усёдазволенасць, радыкальныя суполкі і рухі. Міжнародныя арганізацыі ўсё болей уцягваюцца ва ўнутраныя справы краіны, а некаторыя дзяржавы могуць выказаць жаданне «дапамагчы» беларусам разабрацца.

За пяць гадоў наша краіна прыйшла да апошняй мяжы, за якой - страта незалежнасці і магчымасці ўплываць на свой лёс, лёс сваіх дзяцей і ўнукаў. Зусім не гэта нам абяцаў у 1994-м кандыдат у прэзідэнты А.Лукашэнка.

Сяргей Самасей

Мяснікові не будзе прэм`ерам?

Прэс-сакратар прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Лінга, Іван Знаткевіч, абвергнуў надрукаваную ў газеце «Навіны» 17 жніўня са спасылкай на крыніцу ў адміністрацыі прэзідэнта інфармацыю пра хуткую адстаўку прэм'ера і прызначэнню на гэтую пасаду цяперашняга кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта Міхаіла Мясніковіча.

«Я быў здзіўлены гэтай нататкай і лічу яе беспадстаўнай, —сказаў І.Знаткевіч у тэлефоннай размове з карэспандэнтам. — Натуральна, урад не можа быць недатыкальным, і ў яго працы ёсць хібы, але пра нейкую адстаўку прэм'ер-міністра размовы не вядзецца».

Алесь Абрамовіч

У гонар перамогі пад Воршай

Беларускі Народны Фронт падаў у Менгарвыканкам заяўку на правядзенне 8 верасня ў Мінску традыцыйных шэсця і мітынга «За дэмакратыю, незалежнасць, правы чалавека». Яны прымеркаваныя да Дня вайсковай славы —485-х угодкаў перамогі пад Воршай войскаў Вялікага княства Літоўскага над войскамі Маскоўскага княства.

Збор удзельнікаў святкавання плануецца на плошчы Якуба Коласа ў 17.45. Шэсце, паводле заяўкі, павінна адбыцца на праезджай частцы праспекта Францыска Скарыны і вуліцы Янкі Купалы да плошчы Парыжскай камуны (ля тэатра оперы і балета), дзе з 18.45 да 21 гадзіны адбудзецца мітынг. Падчас шэсця яго ўдзельнікі ўскладуць кветкі да манумента Перамогі на адначменнай плошчы і да помніка Янкі Купалы. Як мяркуецца, у акцыі прымуць удзел каля 10 тысяч чалавек.

Генадзь Барбарыч

Хто ёсць who ў апазіцыі?

Паводле словаў старшыні камісіі Вярхоўнага Савета (ВС) 13-га склікання па міжнародных справах Анатоля Лябедзькі, да пачатку палітычных перамоў апанентам цяперашняй улады неабходна дакладна вызначыцца з крытэрыем апазіцыйнасці.

Пра гэта ён заявіў 13 жніўня падчас сустрэчы з журналістамі. Справа ў тым, сказаў дэпутат, што «ўжо вясной у апазіцыю ўтварылася чарга». Гэта, паводле яговых слоў, звязана са з'яўленнем магчымасці пачатку перамоўнага працэсу. А.Лябедзька лічыць, што ўлады наўмысна спрабуюць зрабіць апазіцыю «як мага больш шматтаблічнай і больш шырокай».

«Ствараецца ўражанне, — сказаў ён, — што ў апазіцыйнасці назіраюцца прырашчэнні. Самае галоўнае, што гэта не цвёрдая глеба, а, па сутнасці, — багна». На думку дэпутата, у Беларусі дзейнічаюць усяго чатыры-пяць рэальных апазіцыйных партый, якія і павінны быць прадстаўлены на перамовах.

Ён лічыць, мінімальнае, што трэба зрабіць апазіцыі на сёння, — мець адзіны каардынуючы цэнтр. Гэтым цэнтрам павінен стаць Вярхоўны Савет, якому шэраг палітычных партый ужо перадалі свае паўнамоцтвы на вядзенне дыялогу з уладамі. Акрамя таго, распрацавана агульная платформа палітычных партый на маючых адбыцца перамовах. Чакаецца, што пасля абмеркавання ў партыях і зацікаўленых грамадскіх арганізацыях, яна будзе зацверджана на пазачарговай сесіі Вярхоўнага Савета, якая запланавана на канец жніўня — пачатак верасня. На сесіі таксама будзе зацверджаны і склад дэлегацыі ад апазіцыі на перамовах.

Юрый Пацёмкін

Лукашэнка ўжо вызначыўся з кім будзе весці перамовы!

«Я не веру ні аднай партыі, ні аднаму руху, за выключэннем тых людзей, якія шчыра хочуць дабра нашым людзям і якія канструктыўна крытыкуюць уладу». Гэта заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на адкрыцці менскай ЦЭЦ-5, каментуючы маючыя адбыцца палітычныя кансультацыі ўладаў з апазіцыяй, у тым ліку і па пытаннях падрыхтоўкі да парламенцкіх выбараў 2000 года.

Напярэдадні гэтай падзеі шэраг буйнейшых апазіцыйных партый прынялі рашэнні аб дэлегаванні сваіх паўнамоцтваў на маючых адбыцца перамовах з уладамі Вярхоўнаму Савету 13-га склікання. Гаворачы пра гэта, А.Лукашэнка адзначыў: «Гэтыя спадары, якія нічога сабой не ўяўляюць, спрабуюць выкарыстаць хоць нейкую структуру, — гнілую, паўгнілую, —для таго, каб неяк сябе паказаць, рэалізаваць або выкарыстаць як зброю для сваіх карыслівых мэтаў, для таго, каб наладжваць цыркацкую рознага роду клаунаду. А сёння не крытыка патрэбная. Сёння патрэбны канкрэтныя дзеянні. Возьміце што-небудзь і зрабіце».

«Я вам павінен сказаць, што там апазіцыі няма як такой, —заявіў Лукашэнка. — Там ідзе бойка паміж Ганчаром і Шарэцкім, паміж Ганчаром, Шарэцкім, Шушкевічам і Багданкевічам і іншымі ўнутры. Уся вось гэтая галоўка палітычная, калі можна так назваць, сканцэнтравана ў трыццаці гэтых дэпутатах, якія засталіся, вось гэтае шмацьцё ад старога Вярхоўнага Савета. Але мы не збіраемся ствараць аўтарытэт вось гэтай галоўцы. Мы не збіраемся ствараць ім аўтарытэт і садзіцца з імі за адзін стол. Я ўжо сказаў, што я ўжо сядзеў і з пазнякамі, і з ганчарамі, і з шарэцкімі за адным сталом. Гэта ж было на вашых вачах... Калі яны хочуць дабра нашай краіне, дык ім трэба не бегчы за мяжу, а дабро рабіць дома. І да выбараў ім трэба неадкладна знайсці працу. З чым яны пойдуць да людзей? «Хачу быць прэзідэнтам...» Няхай, адразу заканамернае пытанне: а што ты зрабіў, дзе ты быў гэтыя гады? А я быў у «апазіцыі», у «парламанце 13-га склікання», або ж «у Амэрыцы ці Эўропе». А чаго ты там ездзіў? Краіна ж тут жыла, тут народ жыў. Таму трэба на працу перш за ўсё уладкавацца, а не хадзіць... Бамжатнік развялі гэты там і называюць гэта яшчэ Вярхоўным Саветам».

Са словаў Лукашэнкі, «калі ідзе размова пра нейкі дыялог —апазіцыі, не апазіцыі (а размова ідзе пра дыялог з палітычнымі партыямі або рухамі, грамадскімі арганізацыямі: яны — і ўлада), — просім. Мы — за. Але гэта не ганчары, шарэцкія і пазнякі, гэта не вячоркі, сіўчыкі ды іншыя. Гэта ж велізарны спектр людзей. Гэта прыкладна 10 працэнтаў насельніцтва, якія сёння так ці інакш знаходзяцца ў апазіцыі. З імі, хацеў бы я гэтага ці не хацеў, я абавязаны размаўляць». На думку кіраўніка дзяржавы, у перамовах павінны ўдзельнічаць прадстаўнікі ўсіх узроўняў улады — «ад сельскага Савета да прэзідэнта» — і «ўвесь грамадска-палітычны спектр» краіны.

Ул. Інф.

ГРАМАДСТВА

Рэспектабельная разынка беларускага авангарду

Яшчэ ў траўні ПАГОНЯ паведамляла пра доўгачаканы выхад шостага нумару літаратурна-мастацкага альманаха «КАЛОСЬСЕ», асобныя публікацыі якога выклікалі неадназначную рэакцыю ў інтэлектуальных колах Беларусі. Прайшоў пэўны час, і я сустрэлася з рэдактарам выдання Юрыем Гуменюком, каб даведацца з першых вуснаў пра некаторыя эпатажныя творы, зазірнуць на «рэдакцыйную кухню» ды проста паразмаўляць пра жыццё і літаратуру.



Юрка Гумянюк

- Мяне, як і кожнага чытача, цікавіць: чаму «КАЛОСЬСЕ» так рэдка выходзіць?

- Па-першае, гэта вельмі дарагі праект, і ў Таварыства Вольных Літаратараў хапае грошай толькі на адзін нумар у год. Затое альманах мае прыстойны выгляд і яго прыемна патрымаць у руках. А па-другое, добрага ніколі не бывае шмат. Нягледзячы на мізэрны наклад, «КАЛОСЬСЕ» ведаюць у Беларусі і за мяжой. Практычна з кожнага новага нумару асобныя творы перакладаюцца ў Польшчы, Расеі, Летуве, на Украіне...

- У апошнім нумары публікацыя некаторых рэчаў выклікала калі не скандал, дык шмат пагалосак і плётак. Маю на ўвазе найперш тваё ўспаміны «Візуальная тэрапія памяці» і апавяданні Сяргея Астраўца.

- Адразу абмоўлюся, што ў кожнай з кніжак «КАЛОСЬСЯ» ёсць такія рэчы, якія выклікаюць неадназначную рэакцыю. Так і павінна быць. Інакш ніхто не будзе чытаць. Зрэшты, мы ніколі не ставілі задачу прыцягнення ўвагі да сябе шляхам танных скандалаў. Я чуў, што людзі, якія пазналі сябе ва ўспамінах, назвалі мой опус амаральным і г.д. Мая задача як творцы, была ў праўдзівым узнаўленні атмасферы і падзеяў мінулых гадоў, мастацкім выяўленні постаці заўчасна памерлага паэта Андрэя Пяткевіча. Увогуле, вялікае глупства лічыць той ці іншы мастацкі твор маральным ці амаральным, бо мараль не з'яўляецца катэгорыяй эстэтыкі. Што тычыцца апавяданняў Сяргея Астраўца, дык натуральна, што яны выклікалі ў прасавецкіх пурытанаў негатыўную рэакцыю.

- Чым адрозніваецца «КАЛОСЬСЕ» ад іншых літаратурных часопісаў? Які ягоны кірунак?

- Як адзначыў культуролаг Юрась Барысевіч, мы - кансерватыўна-рэспектабельная плынь беларускага авангарду. Вялікая доля праўды ў тым ёсць. Для нас галоўнае самавітасць і талерацыя. Галоўнае, каб твор быў неардынарным, нават спрэчным адносна агульнапрынятых нормаў. Так, напрыклад, некалі забракаваныя з эстэтычнага гледзішча ў часопісе «Крыніца» апошні «Як цётка Прузына нацыю шукала» Ігара Сідарука і «Эрагенная зона» Вітаўта Чаропкі атрымалі права на жыццё менавіта ў «КАЛОСЬСІ». Мы першымі надрукавалі ў 1995 годзе успаміны Славаміра Адамовіча «З жыцця грамадзяніна імперыі». Застаецца дадаць, што альманах заўсёды аздоблены цікавымі фотаздымкамі і мастацкай графікай.

- Давай зазірнем на рэдакцыйную кухню. Дзе робіцца ваш часопіс, бо ў друку яго называюць то полацкім, то гарадзенскім? І, увогуле, як адбіраюцца творы для выдання?

- «КАЛОСЬСЕ» ад пачатку свайго адраджэння задумвалася як агульнабеларускі часопіс, бо мы разумелі, што інакш не ўдасца выйсці на прыстойны ўзровень. А робіцца ён і ў Гародні, і ў Полацку, і ў Менску - там, дзе жывуць нашыя аўтары. У эпоху камп'ютараў ды Інтэрнэту гэтае пытанне не мае сэнсу. Вядома, мне, як галоўнаму рэдактару часопіса, даводзілася выконваць асноўную тэхнічную працу дзеля таго, каб «КАЛОСЬСЕ» выглядала такім, якім яно ёсць сёння. Спачатку ў тэхнічным плане мне дапамагалі знаёмыя, бо я тады яшчэ не меў камп'ютара, а пасля, убачыўшы ўсе дызайнерскія ды іншыя хібы, самастойна «адпаліраваў» стылі. І - атрымалася вельмі, як кажуць палякі, элеганцкая рэч! Што тычыцца адбору твораў, дык тут няма праблемы. Вакол «КАЛОСЬСЯ» згуртавалася кола сталых аўтараў, якія ствараюць асноўны корпус тэкстаў, нават не патрабуючы ганарару. Усе яны даўно зрабілі сабе імёны, карацей, літаратары-прафесіяналы. З такімі людзьмі прыемна працаваць.

- А што рабіць дэбютантам, якія толькі пачынаюць пісаць?

- Мы не адмаўляемся і ад дэбютантаў, калі яны добра валодаюць словам. Мы іх самі адсочваем у іншых выданнях і запрашаем да супрацоўніцтва. Бо тое, што дасылаюць, выклікае расчараванне. Людзі не ўмеюць афарміць сваіх думак на пісьме, не валодаюць ані рускай, ані беларускай мовамі...

- Дзе «КАЛОСЬСЕ» можна набыць ці пачытаць гарадзенцам?

- Папярэднія кніжкі выдання павінны быць у абласной і універсітэцкай, а таксама ў бібліятэцы Інстытута ўдасканалення настаўнікаў. А шосты нумар «КАЛОСЬСЯ» можна набыць у кнігарні «Слова», якая зараз месціцца ў выставачнай зале Саюза мастакоў па вул. Ажэшкі, ці на першым паверсе па вул. К.Маркса,11, дзе заўсёды дзейнічае выстава беларускіх касетаў і выданняў.

- Што можна будзе пачытаць у сёмым нумары часопіса?

- Ён збольшага ўжо набраны і заверстаны. Дасць Бог - ўвосень выйдзе. Бо, як паведаміў мне выдавец, з'явіліся грошы на выданне. А ў ім: новы сатырычны раман Вітаўта Чаропкі «Поўны керкешоз», п'еса Сяргея Кавалёва «Стомлены д'ябал» (яе ў чэрвені паставілі ў тэатры «Вольная сцэна» ў Менску), апавяданне Вінцэся Мудрова «Нячысцік у фраку», урывак з рамана класіка мадзьярскай літаратуры Ёкая Мора «Сыны чалавека з каменным сэрцам», паэзія Васіля Дзівашэвіча і Леры Сом, развагі пра сучасную літаратуру крытыка Ганны Кісьліцынай і празаіка Лявона Вашко, успаміны Івана Фурсевіча пра ягоную сустрэчу з сасланым на экібастузскую электрастанцыю былым сакратаром ЦК КПСС Георгіем Малянковым, а таксама рэцэнзіі на кніжкі. Карацей кажучы, тое, чаго ў іншых выданнях не знойдзеш.

- А над чым зараз акрамя часопіса працуе спадар Гумянюк?

- Уласна ні над чым. Адпачываю, плыву па інэрцыі. У мяне сёлета было тры вялікія публікацыі: дзве падборкі вершаў - у часопісе «Крыніца» N1 і ў «ПАГОНІ» ды вышэйзгаданыя ўспаміны ў «КАЛОСЬСІ» N6. У сёмым нумары надрукую яшчэ нізку вершаў. Гэтага дастаткова, каб засведчыць сваю прысутнасць у беларускім літаратурным агаропсе. У чэрвені я напісаў тэксты песень да спектакля «Пінокіо», які рыхтуецца да пастаноўкі ў Гарадзенскім тэатры лялек. Дарэчы, мяне ўвесь час атакуюць эстрадныя выканаўцы, маўляў, давай тэксты для песень, нават прыносяць гатовую «фанеру».

- Дык проста выдатна, калі да паэта ідуць...

- Але гэта вельмі няўдзячная праца падганяць словы пад колькасць тактаў ці перабіраць распеўныя рыфмы. Дый мяне, як сталага аўтара, ужо не спакусіш тым, што маё прозвішча з'явіцца ў тэлевізійных цітрах ці прагучыць у эфіры. Танная слава мне не патрэбна. У Беларусі ж няма так званага шоу-бізнесу, каб на песнях можна было б добра ўсім: і кампазітару, і паэту, і выканаўцу зарабляць. Дарэчы, на мае вершы створана і запісана(!) каля дваццаці песень, якія выконваюць гурты «Айша»(Jungle X-mes), «Грунвальд» і асобныя выканаўцы, многіх я нават не ведаю асабіста. Тут узнікаюць праблемы з аўтарскімі правамі ды цэлы комплекс іншых праблемаў, якія залежыць ад гаротнага стану эканомікі нашай краіны. Пакуль аўтарскія грошы трапяць на твой рахунак, іх зжарэ інфляцыя. Вось таму многія айчынныя артысты імкнуцца працаваць «за наяўныя» або выехаць на заробкі за мяжу.

- У цябе няма такога жадання?

- Як ні дзіўна, няма. Трэба выбіраць: альбо грошы, альбо мастацтва. У мяне ёсць жаданне проста жыць (хацелася б, канешне, прыстойна ды адпаведна статусу творцы), каб займацца мастацтвам дзеля мастацтва.

Гутарыла
Алена Сіневіч

Курсы валют

На 18 жніўня Нацыянальны банк Беларусі ўстанавіў наступныя афіцыйныя курсы валют:

даляр ЗША — 275.000 беларускіх рублёў; еўра — 289.093,75; нямецкая марка — 147.811,29; расейскі рубель — 11.105. У параўнанні з учарашнім днём афіцыйны курс даляра вырас на 1.000 рублёў.

На «чорным» рынку наяўнай валюты ў Менску раніцай 18 жніўня даляр куплялі па 460.000—465.000 і прадавалі па 470.000—475.000 рублёў. У параўнанні з учарашнім днём курс вырас у сярэднім на 5.000 рублёў.

Гарачая вада - толькі для багатых!

З 15 жніўня ў Беларусі на 30 працэнтаў выраслі тарыфы на асобныя віды камунальных паслуг насельніцтву — гарачую ваду і ацяпленне. Пра гэта паведамілі ў камітэце цэн Міністэрства эканомікі краіны. Аблвыканкамам і Менскаму гарвыканкаму даручана прывесці ў адпаведнасць з устаноўленымі каэфіцыентамі тарыфы на камунальныя паслугі.

Трэба адзначыць, што, згодна з новым Жыллёвым кодэксам Беларусі, пры аплаце за ацяпленне ў разлік будзе браццa не жылая, а агульная плошча кватэры. Памер кватэрнай платы з 1 ліпеня таксама вызначаецца, зыходзячы з агульнай плошчы жылля (каб пазбегнуць яе рэзкага павелічэння, дзеючая стаўка паменшана ў 1,6 раза). Прычым па тарыфу насельніцтва будзе аплачваць плошчу з разліку 20 квадратных метраў на аднаго чалавека і дадаткова 10 метраў на сям'ю, а астатняе — па нарматыўным сабекошце, які будуць вызначаць аблвыканкамы і Менскі гарвыканкам.

Акрамя таго, устаноўлены штомесячныя адлічэнні на капітальны рамонт у памеры 50 працэнтаў кватэрнай платы. У асобны від плацяжоў выведзена паслуга за карыстанне ліфтам. Ад уплаты вызваляюцца грамадзяне, якія жывуць ніжэй за трэці паверх дамоў, дзе маецца ліфт. Згодна з новым Жыллёвым кодэксам, кватэрная плата і камунальныя плацяжы павінны ўносіцца не пазней за 15 лічбу наступнага месяца (раней — не пазней за 25-е). Урэшце, яшчэ не ўсе жыллёва-эксплуатацыйныя службы перайшлі на новы рэжым працы: паводле звестак, частка грамадзянаў дагэтуль не атрымала рахункі па кватэрнай плаце за ліпень.

«Да канца года будзе ажыццяўляцца паэтапнае павышэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі да ўзроўня 50 працэнтаў затрат прадпрыемстваў ЖКГ па іх аказанню», — пра гэта заявіў намеснік прэм'ер-міністра краіны Барыс Батура ў інтэрв'ю газеце «Звязда» за 17 жніўня. Ён таксама паведаміў, што цяпер насельніцтва ўносіць не больш за 24 працэнты ад усіх выдаткаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Да гэтага трэба дадаць, што існуе катэгорыя асобаў, якія наогул не плацяць за дадзеныя паслугі. Паводле сцвярджэння Б.Батуры, нядаўняе прыняцце новага Жыллёвага кодэкса краіны «прадугледжвае, што жыхары, якія не плацяць за кватэру на працягу паўгода, могуць быць выселены па рашэнню суда ў жылое памяшканне меншай плошчы».

Дзмітрый Уласаў

«Белэнерга» запланаваў доўгую і халодную зіму

«Надыходзячы асенне-зімовы перыяд 1999-2000 гадоў будзе вызначацца ранняй, працяглай і суровай зімой, дэфіцытам паліва, асабліва газу», - сцвярджаецца ў пісьме-прадпісанні канцэрна «Белэнерга».

Аднак кіраўнікі, адказныя за цеплазабеспячэнне грамадзянаў краіны, упэўненыя, што не дапусцяць збояў, асабліва на аб'ектах сацыяльнай сферы і ў жылых дамах (Цікава, што канцэрн лічыць, быццам мінулай зімой у нашых кватэрах падтрымліваліся нармальныя ўмовы жыццязабеспячэння. Не ўсе з гэтым пагодзяцца, аднак).

«Белэнерга» прадпісвае прытрымлівацца рэжыма эканоміі, строга выконваць ліміты спажывання. Будзе забаронена нават праца фінскіх лазняў у часы ранішняга і вячэрняга максімума спажывання электраэнергіі. На выхадныя дні і ў непрацоўны час тэмпература ў адміністратыўных і вытворчых памяшканнях не можа быць вышэй за 13-14 С.

Міхась Капялюш

Ад такога жыцця пілі, пьюць і будуць піць

Як сведчыць статыстыка, на душу насельніцтва, уключаючы дзяцей, на Гарадзеншчыне прыходзіцца 11 літраў лікёра-гарэлачных вырабаў у год, віна вінаграднага і пладова-ягаднага -13 літраў, піва - 15 літраў. Летась агульная вытворчасць гэтых напояў склала ў вобласці 7 987 дэкалітраў. У параўнанні з 1995 годам вытворчасць гарэлкі і лікёра-гарэлачных вырабаў павялічылася на 6,2 працэнта, віна - у 3,3 раза, піва - на 62,7 працэнта.

Ад выпадковага атручвання алкаголем летась памерла 360 чалавек, у тым ліку 87 жанчын. 75 нябожчыкаў мелі ўзрост ад 20 да 39 гадоў, 125 - ад 40 да 49. 4,9 працэнта пацярпелых на вытворчасці былі на падпітку. А з ліку 32 чалавек, якія загінулі, кожны другі ўжыў алкаголь.

На пачатак бягучага года ў лячэбна-прафілактычных установах вобласці было на ўліку 19,7 тысячы хворых на алкагалізм. Узровень захворваемасці алкагалізмам летась склаў 234,9 чалавека ў разліку на сто тысяч насельніцтва. Гэта ў два разы болей, чым у 1990 годзе. З агульнай колькасці хворых 15,2 працэнта складаюць жанчыны, 8,5 працэнта маюць узрост ад 15 да 19 гадоў. 46,8 працэнта з ліку хворых - жыхары сельскай мясцовасці.

Сцяпан Ярашчук

Удакладненне

ПАГОНЯ прыносіць прабачэнне супрацоўніцу прыёмнай камісіі Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэта Лілію Іванаўну Баброўнік за брыдкае непаразуменне, якое адбылося па віне аўтара артыкула «З абітурыентаў - у студэнты» практыканта газеты Рыгора Кавальчука. Інфармацыя пра апеляцыі абітурыентаў зусім не затойвалася. Па гэтай прычыне, безумоўна, падобная пазіцыя кіраўніцтва прыёмнай камісіі выклікаць падазрэнне, як гэта сказана ў артыкуле, не можа.

Чым больш грошай - тым горш

Любое павышэнне заработнай платы ў Беларусі вядзе да новага вітка інфляцыі і, значыць, да абясцэньвання даходаў насельніцтва.

Калі перыядычнае павышэнне заработнай платы ў Рэспубліцы Беларусь ацэньваць з пункту гледжання яе намінальнай значнасці і рэальнай вагі, то можна зрабіць наступную высновы. Ідзе працэс пастаяннага падцягвання даходаў працоўнага насельніцтва да ўзроўня інфляцыі. Аднак інфляцыя, на жаль, увесь час апярэджвае рост заработнай платы і ўсіх відаў сацыяльных выплатаў.

Згодна з дадзенымі Міністэрства статыстыкі і аналізу, спажывецкія цэны за студзень-ліпень 1999 года ўзраслі на 97,2 працэнта. Такую з'яву інакш як галапіруючай інфляцыяй не назавеш. Гэта пацвярджае і параўнанне з дадзенымі мінулага года. Інфляцыя ў ліпені 1998 года складала 2,8 працэнта, а за першыя сем месяцаў гэтага года - 25,3 працэнта. Значыць, тэмпы інфляцыі ў гэтым годзе амаль у чатыры разы вышэйшыя, чым за такі ж перыяд мінулага года.

У гэтых умовах дзяржаўныя чыноўнікі ўсё часцей гавораць пра хуткае павышэнне заработнай платы. Першым выказаўся старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч. Аднак яго прапанова выклікала здзіўленне, бо эмісіраваць грошы давядзецца нікому іншаму, як Нацбанку. А эмісія, якая ў беларускіх умовах не забяспечана таварамі, як вядома, з'явіцца падставай для далейшага росту цэнаў, што ў сваю чаргу патрабуе чарговага павышэння заробку.

Радыкальныя прапановы па гэтаму пытанню прагучалі і з вуснаў кіраўніцтва Федэрацыі прафсаюзаў. Сутнасць іх у тым, каб мінімальная заработная плата была падвышана да ўзроўня пражыткавага мінімума, і тым самым перастала быць толькі разліковай катэгорыяй. Другое патрабаванне прафсаюзаў заключаецца ў тым, каб паслабіць неапраўданую дыферэнцыяцыю заробку, з аднаго боку, паміж аплатай працы ў рэальнай эканоміцы і ў бюджэтнай сферы; а з другога - паміж высокааплочваемай (канешне, па беларускіх мерках) і нізкааплочваемай працай. Наколькі сур'ёзнай з'яўляецца гэтая праблема, бачна з дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу. Сярэдні заробак працоўных прамысловасці ў чэрвені дасягаў 20,3 мільёна рублёў, у будаўніцтве - 22,1 мільёна, а працоўных сувязі і лясной гаспадаркі - 16,8 мільёна рублёў, працоўных саўгасаў - толькі 11,3 мільёна, калгаснікаў -9,4 мільёна рублёў. Яшчэ больш разбег назіраецца ва ўзроўнях заработнай платы ў невытворчай сферы. Банкаўскія служачыя ў чэрвені атрымалі сярэдні заробак 41,3 мільёна рублёў, а служачыя установаў сацыяльнай забяспекі - 10,9 мільёна.

Іншыя прадстаўнікі кіраўніцтва краіны, акрамя П.Пракаповіча, пакуль не выказаліся пра магчымыя тэрміны і памеры павышэння мінімальнага заробку. Але, згодна з нашымі звесткамі, падрыхтоўка да гэтага вядзецца. Сведчаннем гэтаму з'яўляецца і прыняцце дзвюх пастановаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 20 ліпеня - «Аб мінімальных спажывецкіх бюджэтах для розных сацыяльна-дэмаграфічных групаў насельніцтва» N90 і другога жніўня - «Аб зацвярджанні бюджэта пражыткавага мінімума ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах у цэнах чэрвеня 1999 года».

Сёння, акрамя вышэйназваных, ёсць яшчэ і трэці нарматыўны паказчык, які звязаны з заработнай платай і даходамі сем'яў, - мінімальны заробак (калі пакінуць за межамі разгляду слабую ўспрымальнасць простымі працаўнікамі адрозненняў паміж мінімальным спажывецкім бюджэтам і бюджэтам пражыткавага мінімума). Зараз гэтыя паказчыкі не толькі размежаваныя, але і колькасна вызначаны ў разліку на месяц і ў сярэднедушавым значэнні.

Першы паказчык - у разліку на сям'ю з чатырох асобаў і з улікам полаўзроставых катэгорыяў грамадзянаў. Другі (бюджэт пражыткавага мінімума) - у сярэднім на душу насельніцтва для працаздольных, пенсіянераў, студэнтаў і дзяцей; гэта значыць, па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах. У колькасным значэнні мінімальны спажывецкі бюджэт у сярэднім на душу насельніцтва роўны 15,9 мільёнам, а пражыткавы мінімум - 10,7 мільёнам рублёў. Што з гэтага вынікае? Па-першае, прагледзецца, што ідзе падрыхтоўка да вызначэння канцэпцыі заработнай платы. Па-другое, павышаць сёння заробак без уліку ўжо вызначаных параметраў спажывецкага бюджэта і бюджэта пражыткавага мінімума практычна немагчыма.

Наступнае павышэнне заробку павінна ўлічваць вопыт павышэння іншых даходаў насельніцтва, напрыклад, пенсіяў. Нельга дапусціць, каб павышэнне пенсіяў і заробку ўвесь час даганяла хутка набіраючую тэмпы інфляцыю, бо гэта неэфектыўна. Неабходнасць павышэння заработнай платы абумоўлена ўсёй сукупнасцю вытворчых працэсаў, якія назіраюцца ў эканоміцы краіны. Напрыклад, у пачатку жніўня афіцыйныя ўлады паведамілі, што ўборка ураджая перакрочыла «экватар». Нечаканасцю ў гэтым паведамленні стала тое, што намалочана толькі 2,5 мільёна тон зерня. Сярэдняя ўраджайнасць упала да 19 цэнтнераў з гектара. Калі ўлічыць, што намалочанае зерне - бункернае, і пасля яго ачысткі збор будзе істотна меншым, атрымліваецца, што агульны збор зерня чакаецца толькі ў межах 4-4,5 мільёнаў тон, а не шэсць мільёнаў, як было заяўлена на селектарнай нарадзе ў пачатку ўборкі.

Сітуацыя на хлебным рынку краіны складваецца такім чынам, што давядзецца закупаць за мяжой каля двух мільёнаў тон харчовага і фуражнага зерня. І перамовы накошт гэтага ўжо вядуцца. Усё гэта сказваецца на цэнаўтварэнні на хлеб. У пачатку жніўня хлеба-булачныя вырабы ўжо падаражалі. Яшчэ ў канцы ліпеня хлеб сярэдніх па якасці гатункаў каштаваў у межах 30-ці тысяч рублёў за бохан, зараз - на 10-12 тысяч даражэй, а цана хлеба высокай якасці пераваліла за 80 тысяч рублёў. З вышэйсказанага можна зрабіць выснову, што рост цэнаў на асноўныя прадукты харчавання патрабуе павышэння ўсіх даходаў насельніцтва, і перш за ўсё - заработнай платы.

Асаблівасці сёлетняга сельскагаспадарчага года абумовілі непазбежны дэфіцыт прадукцыі жывёлагадоўлі. За першае паўгоддзе вытворчасць малака і мяса ў краіне скарацілася прыкладна на 10 працэнтаў. На 200 тысяч галоваў зменшылася пагалоўе буйной рагатай жывёлы. У гэтых умовах чакаць насычэння ўнутранага рынку мяса-малочнымі прадуктамі безнадзейна. Як вынік, рост цэнаў непазбежны. Нізкая ўраджайнасць ставіць сельскіх працаўнікоў перад выбарам: ці прадаваць зерне дзяржаве, ці ратаваць ад голаду жывёлу? Вырашэнне гэтай дылемы ў любым выпадку цягне за сабой рост цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю, а, значыць, і наступнае павышэнне заработнай платы.

Такім з'яўляецца сёння замкнутае кола, у якім апынулася беларуская дзяржава.

Уладзімір Кулажанка,
доктар эканамічных навук

Няўжо аўтамабілістаў ізноў узрадуюць новымі пошлінамі?

Рашэннем Дзяржаўнага мытнага камітэта Расейскай Федэрацыі ў пачатку наступнага месяца ўводзяцца новыя мытныя пошліны на легкавыя аўтамабілі, значна ніжэйшыя за тыя, што дзейнічаюць зараз.

Новы памер мытных пошлінаў ва ўсходняга суседа будзе складаць: 0,85 еўра за адзін кубічны сантыметр рухавіка для аўтамабіляў з аб'ёмам рухавіка да 2500 сантымераў кубічных і 1,4 еўра для аўтамабіляў з аб'ёмам рухавіка больш за 2500 сантымераў кубічных.

Зніжэнне мытных пошлінаў у Расейскай Федэрацыі да вышэйадзначанага ўзроўня, на наш погляд, адаб'ецца на памеры мытных пошлінаў на легкавыя аўтамабілі ў краінах мытнага саюза: Беларусі, Казахстане, Таджыкістане. Нагадаем, што ў нашай рэспубліцы з канца сакавіка бягучага года дзейнічаюць мытныя пошліны ў памеры 0,3 і 0,5 еўра за адзін сантыметр кубічны рухавіка: адпаведна для аўтамабіляў з аб'ёмам рухавіка да і пасля 2500 сантымераў кубічных. Прычым для легкавых аўтамабіляў, якім болей як дзесяць гадоў, незалежна ад «кубатуры» мытная пошліна спаганяецца, зыходзячы са стаўкі 0,5 еўра за адзін сантыметр кубічны рухавіка. Аднак, нягледзечы нават на параўнальна нядаўняе змяненне мытных пошлінаў у Беларусі, можа здарыцца так, што аднойчы нашы грамадзяне могуць прачнуцца з расейскім узроўнем мытных пошлінаў на легкавыя аўтамабілі. Справа ў тым, што 2-га жніўня адбылася сустрэча кіраўнікоў мытных камітэтаў Рэспублікі Беларусь ды Расейскай Федэрацыі. Як нам стала вядома, сярод мноства пытанняў абмяркоўвалася і такое, як уніфікацыя (поўная) мытнага заканадаўства абедзвюх дзяржаваў. І хоць афіцыйных паведамленняў не было, сам факт заслугоўвае, на наш погляд, пільнай увагі.

На буйнейшых аўтамабільных рынках краіны ў Менску і Гродне звестку пра будучае змяненне мытных пошлінаў у Расіі прадавецы і пакупнікі аўтамабіляў успрынялі спакойна. У гутарках з аўтамабілістамі мы зразумелі, што ажыўленне на аўтарынках яны звязваюць толькі з дабрабытам суайчыннікаў. Што да пошлінаў, то ў Гродне на апошнім аўтарынку расіянаў было толькі чацвёра. А ў Менску, хаця расіянаў і шмат, але яны так і пакідаюць «базар» патэнцыйнымі пакупнікамі.

За чатыры з невялікім месяцы з апошняга нашага агляду становішча справаў на аўтарынках рэспублікі моцна не змянілася. Попыт і прапанова засталіся на тым жа ўзроўні. Машыны таннеюць, гэта і зразумела - старэе тэхніка. Хоць адны маркі аўтамабіляў старэюць і таннеюць «чамусьці» значна хутчэй за іншыя (**глядзіце табліцу**).

У табліцы пададзены зводныя прапановы па продаж на аўтамабільных рынках Гродна і Менска, бо розніцы ў коштах амаль няма. Адзінае, што ў сталіцы значна больш выбар машын прадстаўнічага класу, і ў гэтай катэгорыі коштаў мы арыентаваліся на Менскі аўтарынак. З нашага красавіцкага агляду цэны на аўтамабілі аналагічнай маркі, мадэлі, стану, году выпуску, наяўнасці «растаможкі» знізіліся: на Audi - у сярэднім на шэсць-сем працэнтаў, на BMW - тры-чатыры працэнты, на Mazda - сем-восем працэнтаў, на Mercedes - тры-чатыры працэнты, на Ford і Opel -восем-дзевяць працэнтаў, на Volvo, Fiat і Toyota на пяць-шэсць працэнтаў, а на Volkswagen - дзевяць-дзесяць працэнтаў.

Колькасць прадстаўленых на продаж растаможаных аўтамабіляў пераўзыходзіла нерастаможаныя болей чым у два разы. Пры чым, з пункту гледжання пакупніка больш выгадна было купляць аўтамабіль да 5000 у.а., ужо растаможаны. Напрыклад, Audi-100 1984 года выпуску - за 2300 у.а. Тады як аналагічны нерастаможаны аўтамабіль каштаваў 1600 у.а., што з улікам пошліны і збору ў ДАІ значна вышэй за 2300 у.а. Калі купляць трэба было больш дарагую машыну, дык сітуацыя выглядала процілеглым чынам. Напрыклад, нерастаможаны Lincoln continental 1993 года выпуску каштаваў 7900 у.а., калі побач аналагічны растаможаны - 12500 у.а. Хаця ўсё «афармленне» на беларускія нумары склала б крыху больш за 2000 у.а.

Паводле дадзеных фірмы «Artkes», якая спецыялізуецца ў аўтабізнесе, у асноўным прадаюцца аўтамабілі да 3000 у.а., а таксама аўтамашыны не старэйшыя 1990 года выпуску, як растаможаныя, так і нерастаможаныя. Прадаць жа аўтамабіль 1986-1989 года выпуску зараз найбольш цяжка. Асабліва калі ваш жалезны конь каштуе болей чым 3000 у.а.

Апошняя «навіна», якая абмяркоўваецца сярод аўтааматараў - гэта ўмацаванне нямецкай маркі і еўра ў адносінах да даляра ЗША. На 6 жніўня за «Вашынгтона» давалі 1,82 нямецкай маркі, замест 1,93 16 ліпеня бягучага года. Умацаванне еўрапейскіх валют, калі яно будзе працягвацца бліжэйшым часам, можа злёгку прыпыніць зніжэнне коштаў на германскі і другі еўрапейскі аўтамабільны імпарт. Уплыву ж змяненняў у мытных пошлінах Расіі на кошты аўтамабіляў не заўважана. Можа, гэта адбудзецца пасля ўніфікацыі «растаможкі» з Беларуссю. Бо пры ўзроўні будучых расейскіх мытных пошлінаў у нашай дзяржаве колькасць новых імпартных аўтамабіляў павінна значна паменшыцца. Акрамя таго, хто ж з грамадзянаў Беларусі будзе плаціць за «афармленне» машыны па 3000 даляраў, калі за год сярэднестатыстычны беларус атрымлівае менш як 500 даляраў? На нашу думку, лічаныя суайчыннікі адважацца на такі крок.

Сяргей Міронаў

Табліца

Марка і мадэль аўтамабіля	Год выпуску	Растам. ці не	Кошт
Audi 80	1981	-	800
Audi 80	1984	+	1900
Audi 80	1991	+	4900
Audi 100	1984	-	1600
Audi 100	1984	+	2300
Audi 100	1990	+	4000
Audi 100	1993	+	7900
Audi 200	1985	-	2000
Audi 5000	1986	+	3900
Audi A6	1996	-	10000
Audi A6	1998	+	19000
BMW 320	1991	+	7000
BMW 520	1989	-	3900
BMW 520	1991	+	5200
BMW 525	1988	+	4300
BMW 530	1992	+	8000
BMW 530	1993	-	6000
BMW 535	1993	+	10000
BMW 730	1993	+	10500
BMW 730	1994	+	11000
BMW 735	1992	+	10000
BMW 740	1996	+	25000
BMW 740	1997	+	30000
BMW 750	1992	+	11500
BMW 850	1993	+	20000
Ford Escort	1999	+	8900
Ford Fiesta	1992	-	2700
Ford Mondeo	1995	+	5800
Ford Mondeo	1997	+	7500
Ford Orion	1990	-	1900
Ford Scorpio	1986	+	2000
Ford Scorpio	1987	+	2300
Ford Scorpio	1989	+	3200
Ford Sierra	1987	+	2000
Ford Sierra	1991	+	3100
Mazda 626	1989	+	2900
Mazda 626	1993	+	5000
Mazda 626	1996	+	6300
Mercedes 200	1983	+	2000
Mercedes 200	1984	+	2200
Mercedes 200	1989	+	5000
Mercedes 200	1992	+	8000
Mercedes 300 E	1991	+	10000
Mercedes 500 S	1985	+	6900
Mercedes 600 S	1992	+	16500
Opel Astra	1993	-	4900
Opel Vectra	1992	+	5500
Opel Omega	1991	+	3900
VW Golf	1989	-	2000
VW Golf	1994	+	5900
VW Passat	1988	-	1900
VW Transit	1984	+	2500
VW Vento	1993	+	4990

Прыватызацыя працягнута і для грамадзянаў

. ПАГОНЯ працягвае тэму прыватызацыі (N47 (424) і N49 (426) ад 27 ліпеня і 5 жніўня 1999 года адпаведна). Сёння размова пойдзе пра прыватызацыйныя магчымасці простых грамадзянаў.

Нагадаем, што Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25.06.99 г. у нашай дзяржаве прыватызацыя падоўжана да першага ліпеня 2002 года, а магчымае пагашэнне іменных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» - да 30 чэрвеня 2004 года. Для выканання вышэйназванай пастановы Старшыня Камітэта па распараджэнню акцыямі Міндзяржмаёмасці В.Магілявец зацвердзіў новы спіс адкрытых акцыянерных таварыстваў. Іх акцыі з 10 жніўня 1999 года па 10 лютага 2000 года грамадзяне Рэспублікі Беларусь могуць абмяняць на іменныя прыватызацыйныя чэкі ў ААБ «Беларусбанк».

Спіс N15 (так названы зацверджаны спіс) уключае 64 адкрытыя акцыянерныя таварыствы (ААТ). Сярод іх такія вядомыя ў рэспубліцы прадпрыемствы, як Віцебскі прыборабудаўнічы завод, Рэчыцадрэў, Пінскае прамыслова-гандлёвае аб'яднанне «Палессе», Гарадзенскае ААТ «Белкард» і Барысаўскае ААТ «Барысаўдрэў».

Згодна з меркаваннямі спецыялістаў, акцыі вышэйназваных ААТ - найлепшыя з прапанаваных на сённяшні дзень пры абмене на іменныя прыватызацыйныя чэкі.

Сёння ў ААБ «Беларусбанк» для абмена чэкаў «Маёмасць» таксама прапануюцца акцыі васьмі ААТ Гарадзенскай вобласці (+ «Белкард»). Адзін чэк можна абмяняць на адну акцыю «Спецмантажбуд-178» пры намінальным кошце акцыі 150 тысяч рублёў; два чэкі на адну акцыю «Радыётэхнікі» горада Ашмяны або «Гроднамантажаўтаматыка», або шчучынскае «Хлебапрыёмнае прадпрыемства» пры намінальным кошце акцыяў 5; 300 і 300 тысяч адпаведна. Акцыі «Мастоўдрэў», «Гарадзенскі дрэваапрацоўчы камбінат» і «Роскі камбікормавы завод» абменьваюцца на чатыры іменныя прыватызацыйныя чэкі (намінальны кошт 512; 10 і 140 тысяч). А акцыі ААТ «Белкард» і ААТ «Гарадзенскі камбінат будматэрыялаў» абменьваюцца адна да 20 чэкаў пры намінальным кошце кожнай акцыі 50 тысяч рублёў.

На наш погляд, кошт усіх без выключэння акцыяў ААТ са спісу N15 вельмі заніжаны. Тым не менш, лепей усё ж абменьваць сёе іменныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць» на акцыі прадпрыемстваў і мець хоць нейкія дывідэнды ад «беларускай прыватызацыі», чым чакаць чэрвень 2000 года і спадзявацца на магчымасць атрымаць праз пяць гадоў наяўныя рублі. Згодна з нашымі прагнозамі, сума будзе эквівалентнай чатыром далярам ЗША за 100 іменных прыватызацыйных чэкі ў 2004 годзе.

На заканчэнне мы нагадваем нашым чытачам, што афармленне дакументаў для абмена чэкаў «Маёмасць» на акцыі ААТ адбываецца ў раённых філіялах ААБ «Беларусбанк» па месцу жыхарства грамадзяніна. Таксама заўважым, што для абмена на акцыі прадпрыемстваў, якія прыватызуюцца, прымаюцца чэкі, налічаныя грамадзянам, атрыманыя ў спадчыну, пераафармленыя грамадзянам ад сваякоў і г. д., але не болей за 250 чэкаў сумарна на працягу ўсяго перыяда бязвыплатнай прыватызацыі.

Кацярына Зволін

ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ

Беларускі Фронт - беларуская палітыка

Дачыненьні Расеі

Усе расейскія палітычныя сілы і палітыкі адзіныя ў імкненьні далучыць («інтэграваць») Беларусь у Расею. «Палітычная Расея» стаіць на імпэрскіх пазыцыях. У 1994 годзе расейскія спэцслужбы, пракамуністычныя і праімпэрскія колы зрабілі стаўку на А.Лукашэнку ў Беларусі, дапамагалі яму ўзяць і ўмацаваць уладу, а ў 1996 годзе -зрабіць канстытуцыйны дзяржаўны пераварот. Пачалася палітыка інкарпарацыі Беларусі ў Расею.

У 1996-97 гадах інкарпарацыю ўдалося стрымаць, дзякуючы адчайнаму супраціўленьню беларускай нацыянальна-вызвольнай апазыцыі ды супярэчнасьцям унутрырасейскай палітычнай барацьбы.

Пасьля 1997 года ў расейскіх палітычных структурах, зьвязаных зь бізнэсам і эканамічнымі рэформамі, узьнікла думка замяніць Лукашэнку на іншага, больш прадказальнага і лібэральнага стаўленіка з іміджам дэмакрата. Мэтад - выбары. Таму неабходна было выключыць фактары рызыкі: разбурыць беларускія нацыянальна-вызвольныя арганізацыі (найперш - БНФ), выцесьніць, скампраметаваць ці «нэйтралізаваць» лідэраў і магчымых супернікаў на выбарах.

Першы сур`ёзны праект у гэтым накірунку - апазыцыйныя выбары прэзыдэнта Беларусі. Галоўная задача - разбурыць нацыянальна-вызвольны рух, зганьбіць кіраўнікоў, увесьці ў інфармацыйную сьвядомасьць імёны новых «лідэраў» і зарыентаваць яе на намэнклятурную апазыцыю.

Мэханізм дзеяньняў стаў галоўны лёзунг апазыцыі - «адзінства ўсіх дэмакратычных сілаў» (без вызначэньня нацыянальных прынцыпаў і нацыянальнай пэрспэктывы).

Праект праваліўся ў выніку жорсткай барацьбы і шэрагу выпадковасьцяў, але разбуральныя вынікі яго - велізарныя. Яны выклікалі раскол у Беларускім Народным Фронце.

Дычыненьні Захаду

Захаду было б дастаткова бачыць Беларусь як больш-менш стабільную краіну з прадказальнай уладаю і палітыкай, дзе ёсьць элемэнтарная павага да законнасьці ды асноўных прынцыпаў дэмакратыі. Астатняе -пытаньне развіцьця і ўзаемных стасункаў. «Астатняе» - цяпер Захад мала цікавіць.

Захад абыякавы да нашых беларускіх нацыянальных праблемаў. (Невялікія разыходжаньні паміж больш радыкальнай («прабеларускай») пазыцыяй ЗША і памяркоўнай («канфармісцкай») пазыцыяй Эўропы - ролі не адыгрываюць). Акрамя таго, Захад ня хоча турбаваць Расею. Таму захоўная салідарнасьць зарыентаваная на кантакты і на падтрымку ня больш моцнага, пэрспэктыўнага і пагрунтаванага ў масах беларускага нацыянальна-вызвольнага руху, а на слабую, але канфармісцкую (не антырасейскую) каляніяльную апазыцыю.

Уплыў на разьвіцьцё дэмакратыі ў Беларусі Захад ажыцьцяўляе найперш праз розныя дапамогавыя фонды і арганізацыі, якія выдаткоўваюць грашовыя гранты недзяржаўным пад пэўныя праграмы. Утварылася цэлая сетка недзяржаўных дэмакратычных арганізацыяў (НДА), створаных пад заходнюю дапамогу і пад патрабаваньні грантадаўцаў.

Дзейнасьць па ўтварэньні і падтрымцы НДА мае і станоўчыя, і адмоўныя вынікі: пашырае дэмакратычныя ідэі, асьвету, інфармацыю, друк, дапамагае вучыцца і працаваць і адначасна - плодзіць ілюзіі, імітатараў, разьвальвае беларускія палітычныя арганізацыі, разбэшчвае людзей.

Недзяржаўны («незалежны») друк

Амаль увесь недзяржаўны пэрыядычны грамадзска-палітычны друк на Беларусі ў той ці іншай ступені настроены апазыцыйна да рэжыму Лукашэнкі. Амаль увесь ён адлюстроўвае погляды каляніяльнай апазыцыі і ў асобных выданьнях пасьлядоўна варожы беларускаму нацыянальна-вызвольнаму руху (найперш - БНФ). Амаль увесь ён, поўнасьцю ці часткова, друкуецца на расейскай мове.

Толькі некалькі нешматнакладных газэтаў, што выдаюцца ня ў Менску, адлюстроўваюць пазыцыі нацыянальна-вызвольнага руху, прыхільныя да БНФ і друкуюцца па-беларуску.

Беларускі Народны Фронт

Беларускі Народны Фронт сваім зьместам, ідэялёгіяй і структурай адлюстроўвае рэальнае грамадзкае становішча беларускай нацыі. Беларускае грамадзтва зараз, у канцы ХХ стагодзьдзя, павінна вырашаць ня толькі праблемы постсавецкія, посткамуністычныя (пытаньні ўлады), але і посткаляніяльныя, якія не былі вырашаныя ў 1918 годзе (праблема беларускай мовы, беларускай нацыянальнай сьвядомасьці, беларускіх школаў, гісторыі і г. д.). Таму Фронт, па сутнасьці, ёсьць і грамадзкая, і палітычная арганізацыя адначасова, займаецца і культурніцтвам, і палітыкай, ёсьць адначасна і партыяй, і рухам, мае два Статуты і здвоеныя сілы. У гэтым моц БНФ.

Зь існаваньнем і дзейнасьцю Народнага Фронту зьвязана адраджэньне незалежнасьці і нацыянальная будучыня Беларусі. Пачынаючы з 1988 года, антыбеларускія сілы ўсімі сродкамі змагаюцца супраць Фронту. Стратэгічна вызначаны два накірункі палітычнага зьнішчэньня БНФ:

- стварэньне адмоўнага адваротнага іміджу арганізацыі і кіраўніку Фронту;
- раскол арганізацыі.

Але раскол арганізацыі можна было ажыцьцявіць толькі знутры. Усе спробы разбурыць Фронт нічога не далі, пакуль не пачалося беспрынцыпнае ўзаемадзеяньне з каляніяльнай апазыцыяй. Травеньская выбарчая авантура намэнклятурнай апазыцыі (фальсыфікацыя галасаваньня) і рашучы выхад зь яе сяброў БНФ сталі пачаткам рэальнага падзелу Фронту, паказалі, наколькі глыбока адбылося пранікненьне ў Фронт іншых прынцыпаў ды іншага сьветапогляду, а зь імі - іншай этыкі ды іншых паводзінаў.

VI Зьезд БНФ (31 ліпеня - 1 жніўня гэтага году) засьведчыў падзел Фронту на дзьве паловы і дзьве пазыцыі, якія ўмоўна можна назваць так: грамадзкая пазытывісцкая (Л.Баршчэўскі, В.Вячорка, В.Івашкевіч, А.Бяляцкі, Ю.Хадыка, М.Баўсюк ды інш.) і палітычная кансэрватыўная (Ю.Беленькі, З.Пазьняк, У.Старчанка, А.Крыварот, М.Анцыповіч, С.Папкоў ды інш.). Агульнымі зьяўляюцца ідэі беларускага нацыянальнага адраджэньня.

Словы аб адзінстве Фронту ў гэтай сытуацыі выяўляюць трывогу перад яго разбурэньнем і гавораць пра разуменьне неабходнасьці адзінства, але ранейшай еднасьці ўжо не прадугледжваюць. Яе няма. Існуе (створана, зроблена) іншая рэальнасьць, іншыя дачыненьні. Павінна быць іншае адзінства.

Новае адзінства

Іншага адзінства неабходна дасягнуць як найхутчэй. Пакіну ў баку, хто рыхтаваў раскол, дзеля чаго, як, зь якімі мэтамі ды ўвогуле маральна-палітычныя ацэнкі таго, што сталася. Зыходжу з рэальнасьці.

Беларускі Народны Фронт ёсьць ужо падзелены. Адзінай арганізацыяй (з адзінай структурай і адзіным кіраўніцтвам) ён ужо не застанецца, а калі застанецца, дык нармальна дзейнічаць ня зможа і расколецца з больш разбуральнымі вынікамі і большай стратай часу.

У гэтай сытуацыі старшыня Фронту, згодна Статуту БНФ, быў выбраны на VI-м Зьездзе зь перавагай толькі ў чатыры галасы (прытым, канфліктуючы бок заявіў, што не прызнае яго выбраньня). Вось адлюстраваньне становішча.

Істотныя ня толькі розныя пазыцыі ды аб'ектыўныя фактары, але і ўзаемадачыненьні. Бальшыня фронтаўскіх крытыкаў ня ўмелі паводзіць сябе ў палітычным канфлікце: былі публічна сказаныя словы нянавісьці і зьнявагі, скарыстаныя мэтады з арсэналу «разборак» намэнклятуры і прыёмаў бясслаўнай травеньскай прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі.

Наступствы такіх дачыненьняў адразу не зьнікаюць нават на адлегласьці, тым больш, што яны зыходзяць з розных групаў і з розных поглядаў на дзейнасьць і задачы БНФ. Калі ў 1995 годзе пастаноўка пытаньня аб расколе Фронта на партыю і рух выглядала штучна, зыходзіла толькі з амбіцыяў вельмі вузкага кола асобаў, то зараз, праз чатыры гады развальнай працы (ня толькі гэтых асобаў), становішча кардынальна згоршала.

Вопыт і жыцьцёвыя прыклады паказваюць, што ў сытуацыі пазыцыйнага і арганізацыйнага падзелу былое адзінства арганізацыі ўтрымаць ужо немагчыма. Штучнае стрымліваньне прывядзе да катастрофы. Трэба зыходзіць з таго адзінства, якое засталося - з адзінства беларускай нацыянальнай ідэі, адраджэнскіх прынцыпаў і мэты. Трэба замацаваць гэтае адзінства ў новай сыстэмна-структурнай арганізацыі БНФ.

Неабходна прызнаць пазытывісцкую плятформу, зарыентаваную на НДА і на грамадзкую дзейнасьць, і даць ёй магчымасьць арганізацыйна афармiцца. За гэтай пазыцыяй стаіць меншая колькасьць фронтаўцаў. (Падзел на Зьезьдзе - амаль напалову). Трэба прызнаць яе як частку Народнага Фронту, прызнаць за ёй Статут БНФ і права дзейнічаць згодна Статуту (выбары кіраўніцтва, стварэньне структураў і г. д.).

Кансэрватыўная пазыцыя ў БНФ (зарыентаваная на традыцыйныя каштоўнасьці і на канцэптуальную палітычную дзейнасьць) арганізацыйна афармляецца як партыйная частка Народнага Фронту. За ёй прызнаецца Статут Партыі БНФ і права дзейнічаць згодна Статуту (выбары кіраўніцтва, стварэньне структураў і г. д.).

Абедзьве часткі БНФ існуюць як самастойныя арганізацыі і ўтвараюць кааліцыю Беларускага Народнага Фронту. Кааліцыя БНФ ня ёсьць асобнай арганізацыяй, ня мае агульнага Статуту і супрацоўнічае на падставе дамоўленасьці. Каардынацыя працы адбываецца праз Кансультатыўную Нараду, куды ўваходзяць старшыні і прадстаўнікі абедзьвюх арганізацыяў. Пастаянны старшыня Кансультатыўнай Нарады не выбіраецца. Нарада можа зьбірацца ў любы час па меры неабходнасьці. Для рэгулярнага абмену інфармацыяй Нарада зьбіраецца не радзей, чым адзін раз у месяц.

Прапанаваная новая структурная сыстэма БНФ як Кааліцыя адраджэнскіх вызвольных арганізацыяў адлюстроўвае сытуацыю, дае магчымасьць хутка, бязь юрыдычных і арганізацыйных цяжкасьцяў, апанаваць становішча, спыніць паглыбленьне расколу і наладзіць скаардынаваную працу.

Пры такім падыходзе, калі асобныя арганізацыі дзейнічаюць як кааліцыя, застаецца агульная, ужо зацьверджаная сымболіка, агульныя офісы і штаб-кватэры і нават некаторыя агульныя камісіі (напрыклад, па экалёгіі, па культуры ды інш.).

Ня ўзьнікне тэхнічных праблемаў з удзелам у выбарах, бо кааліцыя БНФ ужо будзе існаваць (гэта гатовы выбарчы блёк). Да таго ж, да яе могуць далучыцца іншыя самастойныя нацыянальна-вызвольныя і культурніцкія арганізацыі. Зьяўляецца магчымасьць стварыць скаардынаваны адраджэнскі нацыянальна-вызвольны блёк, разьвітацца з канфармізмам і спыніць каляніяльную дэмагогію пра «объединение всех демократических сил». Кааліцыя нацыянальна-вызвольных арганізацыяў можа каардынавацца тады з усёй намэнклятурна-дэмакратычнай апазыцыяй па схеме «1-1», а не «1-35», як увесь час хацелася каляніяльным камбінатарам, спэцслужбам і творцам фантомаў.

Адным словам, у нас ёсьць магчымасьць накіраваць сілу ўдара па Фронту супраць тых, хто наносіць удар, ператварыць раскол з фактару распаду і самазьнішчэньня ў фактар згуртаваньня на іншым сыстэмным узроўні.

Неабходную падрыхтоўчую працу трэба зрабіць да першага верасьня, і на другім паседжаньні Зьезду адразу вырашыць усе фармальныя пытаньні па абдуманым размежаваньні і згуртаваньні (стварэньне кааліцыі БНФ).

Калі прыйсьці на Зьезд, не дамовіўшыся аб стваральным выніку, то вынік можа быць разбуральным, выключыць Фронт з нармальнай грамадзка-палітычнай працы на доўгі час і прывядзе да вялікіх стратаў.

Моладзь, калі ўзьнікае неабходнасьць, можа абараніць Радзіму нават цаной самаахвяраваньня. Але грамадзтва павінна берагчы моладзь.

Сур'ёзная, пасьлядоўная палітычная дзейнасьць вымагае вопыту, псыхалягічнай сьпеласьці, наяўнай адукацыі (цэнзу), становішча ў грамадзтве, аўтарытэту, матэрыяльнай самастойнасьці і г. д. Маладыя павінны яшчэ гэтага дасягнуць. Яны ня мусяць прыносіць у ахвяру палітычным жарсьцям, руціннаму і малому сваю будучыню, якая павінна стаць будучыняй сьветлай і вольнай Беларусі. Галоўнае, каб малады хлапец, маладая дзяўчына былі адукаванымі асобамі, сьвядомымі беларускай культуры і беларускай нацыі. Беларускія маладыя людзі мусяць у гэтым сабе дапамагаць і падтрымліваць адзін аднаго. Зь цягам часу (з узростам) будуць зьмяняцца ацэнкі і дачыненьні ў палітыцы і ў жыцьці, але галоўнае павінна злучаць усіх: Бог у душы - «Беларусь - гэта сьвятое»; беларуская мова ёсьць Боскі дар, наша вялікая мова; беларуская дзяржава ёсьць наш беларускі дом - даражы ёй, як бацькам і маткай; наш бел-чырвона-белы сьцяг і гэрб Пагоня ёсьць сымбалі нашага існаваньня.

Малады Фротн павінен застацца арганізацыйна адзіным і мець сваю моладзевую канцэпцыю беларускіх нацыянальных каштоўнасцяў, духоўнага беларускага асьветніцтва і змаганьня за ідэалы. Арганізацыйнае адзінства Маладога Фронту ў гэтай сытуацыі - задача цалкам вырашальная і залежыць ад саміх маладафронтаўцаў.

Дачыненьні, якія трэба мець на ўвазе

Падрыхтоўка «каляніяльнай» замены Лукашэнкі, нягледзячы на правал праекту «Чыгір», працягваецца. Ёсьць відавочныя вынікі гэтай дзейнасьці. Выключаныя з палітыкі Г.Карпенка, Ю.Захаранка, адсунуты ў бок і выгнаны зь Беларусі С.Шарэцкі, рэзка і татальна ўзмоцнена «вечная барацьба» з Пазьняком (гэта значыць са мной), Народны Фронт расколаты і працягваецца яго разбурэньне. У бліжэйшы час будзем назіраць спробы перакуліць (у літаральным сэнсе слова) частку сяброў БНФ.

Выстаўлены дзьве фігуры - спадары М.Чыгір і В.Ганчар (потым застанецца адна). Зараз апазыцыйную групу Вярхоўнага Савета (легітымнасьць якой прызнае Захад і Народны Фронт) узначаліў В.Ганчар. Неўзабаве можна чакаць фармальнага зьмяшчэньня С.Шарэцкага з пасады Старшыні Вярхоўнага Савета (калі ён ня стане выконваць абавязкі прэзыдэнта). Не сумняваемся, што Масква ведае, куды захоча ўкласьці грошы. Плян замены каляніяльнай адміністрацыі на Беларусі запрацуе з новай сілаю. БНФ вымушаны будзе разабрацца за прызнаньнем легітымнасьці Вярхоўнага Савета і авантурызмам яго новага скандальнага кіраўніка, да якога няма даверу.

Выйсьце з гэтага стану было прапанавана яшчэ год таму - стварэньне Грамадзянскага Парляманту Беларусі. Небясьпеку ідэі Грамадзянскага Парляманту апаненты адчулі адразу і абвалілі на яе цяжар крытычнай дэмагогіі. Каляніяльная апазыцыя ўжо выйграла час. Тым ня менш - ня ўсё страчана. Трэба працягваць працу па стварэньні Грамадзянскага Парляманту, а таксама паспрабаваць па-новаму глянуць на магчымасьці сфармаваньня Часовага Ўраду Беларусі выконваючым абавязкі Прэзыдэнта.

Пакуль ня будзе створана альтэрнатыва рэжыму і Лукашэнку, усе намаганьні ўсёй апазыцыі ў Беларусі ні да чаго не прывядуць. Альтэрнатыву імкнецца стварыць каляніяльная апазыцыя і Масква. Трэба стварыць нашу альтэрнатыву. Яна павінна быць вызвольнай і беларускай.

Зянон Пазьняк, Старшыня Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне», 8 жніўня 1999 г.

Панядзелак, 23

НАШЕ КИНО

9.05 Сериал "Горячев и другие". 29-я серия. "Жилье и жулье"; 30-я серия. "Марш Мендельсона".
10.00 КиНовости.
10.10 Марафон премьер на канале "Наше кино". Борис Ташкентский в музыкальной комедии Николая Солодова "Черный жемчуг".
11.25 Лекарство против стресса. Юрий Никулин, Георгий Вицин и Евгений Моргунов в комедийной новелле Леонида Гайдая "Пес Барбос и необычный кросс". (Из альманаха "Совершенно серьезно").
11.35 Эммануил Виторган, Клара Лучко и Александр Белявский в остросюжетной драме Рудольфа Фрунтова "Тревожное воскресенье".
12.55 Марина Неелова и Юозас Будрайтис в мелодраме Родиона Нахапетова "С тобой и без тебя".
14.20 Мультфильм "Мистер Пронька".
14.45 Черно-белое золото. Сериал "Семнадцать мгновений весны". 5-я серия.
15.50 КиНовости.
16.00 Черно-белое золото. Сериал "Семнадцать мгновений весны". 6-я серия.
17.15 Николай Гринько и Марина Влади в биографическом фильме Сергея Юткевича "Сюжет для небольшого рассказа" (СССР - Франция).
18.40 Памяти Елены Майоровой. Наталья Гундарева, Александр Михайлов, Тамара Семина и Елена Майорова в лирической комедии Самсона Самсонова "Одиноким предоставляется общежитие".
20.05 Сериал "Горячев и другие". 31-я серия. "Царь обезьян возвращается"; 32-я серия. "Страсть".
21.00 КиНовости.
21.10 Витаутас Паукште и Александр Балуев в кинодраме Александра Кайдановского "Жена керосинщика".

МИР КИНО

9.35 Нино Манфреди и Франсуаза Фабьян в детективном сериале "Комиссар в Риме" (Италия). Д-12. 4-я серия. "Самба".
10.40 Винсент Реган, Ли Росс и Росс Боутмен в гангстерском боевике Дж.Кея Амалу "Братва" (Великобритания - Франция). Д-17.
12.05 КиНовости.
12.15 Жерар Депардье, Мишель Пикколи и Сильвия Кристель в комедии Франсиса Жиро "Рене по прозвищу "Ля Кан" (Италия - Франция). Д-17.
13.55 Мир киноприключений. Мартин Хьюит, Бетси Рассел и Шерилин Фенн в остросюжетном фильме Аллана Хольцмена "Без присмотра" (США). Д-17.
15.20 "Крупный план. Эмма Томпсон".
15.40 Эмма Томпсон и Филлиада Лоу в драме Алана Рикмана "Зимний гость" (Великобритания - США). Д-17.
17.30 Марек Кондрат, Малгожата Печиньска, Артур Жмиевский и Алеша Андреев остросюжетном сериале "Экстрадиция" (Польша). Д-16. 6-я серия.
18.25 КиНовости.
18.35 Люцина Винницка и Збигнев Цибульский в психологической мелодраме Ежи Кавалеровича "Загадочный пассажир" (Польша). Д-13.
20.10 Роб Браун, Коринна Клери и Джон Стайнер в фантастическом фильме Энтони Доусона "Йор - охотник будущего" (Италия). Д-13.
21.40 Миранда Ричардсон, Бренда Фрикер и Майкл Онткин в драме "Свонн" (Канада - Великобритания). Д-13.
23.15 - 0.50 Джефф Уинкотт, Терри Хоукс и Дэвид Болт в боевике Дэвида Митчела "Машина для убийств" (США). Д-17.

СПОРТ

9.00 Пресс-центр
9.15 "Еще неделя позади"
9.45 Аэробика
10.10 Урок волейбола
10.25 Крути педали.Тележурнал
11.00 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
11.30 Тайский бокс
12.25 Аэробика
12.50 Пресс-центр
13.00 На чемпионате мира по легкой атлетике
13.30 Конный спорт. Конкур. Этап Кубка России.
15.00 Пресс-центр
15.10 Урок волейбола
15.10 Хроника автомобильных аварий
16.20 Хоккей. Международный турнир Кубок Спартака. Матч ветеранов. Звезды России- Ветераны хоккея.
18.20 Пресс-центр
18.30 На чемпионате мира по легкой атлетике
19.00 "Железный фактор". Тележурнал
19.30 "Хроника недели"
20.05 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
20.35 Большой ринг
22.35 Удивительные игры народов мира. Ирландия
23.00 Пресс-центр. На чемпионате мира по легкой атлетике
23.20 Новости

Аўторак, 24

НАШЕ КИНО

9.05 Сериал "Горячев и другие". 31-я серия. "Царь обезьян возвращается"; 32-я серия. "Страсть".
10.00 КиНовости.
10.10 Лекарство против стресса. Наталья Гундарева, Александр Михайлов, Тамара Семина и Елена Майорова в лирической комедии Самсона Самсонова "Одиноким предоставляется общежитие".
11.35 Николай Гринько и Марина Влади в биографическом фильме Сергея Юткевича "Сюжет для небольшого рассказа" (СССР - Франция).
13.00 Витаутас Паукште и Александр Балуев в кинодраме Александра Кайдановского "Жена керосинщика".
14.35 Черно-белое золото. Сериал "Семнадцать мгновений весны". 6-я серия.
15.50 КиНовости.
16.00 Черно-белое золото. Сериал "Семнадцать мгновений весны". 7-я серия.
17.10 Лекарство против стресса. Вера Васильева, Владимир Ушаков, Виталий Доронин и Татьяна Пельтцер в музыкальной комедии Татьяны Лукашевич и Бориса Равенских "Свадьба с приданым".
18.55 Сериал "Горячев и другие". 33-я серия. "Прошло время..."; 34-я серия. "Долгие платежи"; 35-я серия. "Предварительные итоги".
20.15 КиНовости.
21.25 Звездный билет. Лариса Гузеева в мелодраме Эльдара Рязанова "Жестокий романс". 2 серии.

МИР КИНО

9.35 Марек Кондрат, Малгожата Печиньска, Артур Жмиевский и Алеша Андреев остросюжетном сериале "Экстрадиция" (Польша). Д-16. 6-я серия.
10.30 Джефф Уинкотт, Терри Хоукс и Дэвид Болт в боевике Дэвида Митчела "Машина для убийств" (США). Д-17.
12.05 КиНовости.
12.15 Люцина Винницка и Збигнев Цибульский в психологической мелодраме Ежи Кавалеровича "Загадочный пассажир" (Польша). Д-13.
13.50 Роб Браун, Коринна Клери и Джон Стайнер в фантастическом фильме Энтони Доусона "Йор - охотник будущего" (Италия). Д-13.
15.25 Миранда Ричардсон, Бренда Фрикер и Майкл Онткин в драме "Свонн" (Канада - Великобритания). Д-13.
17.00 Марек Кондрат, Малгожата Печиньска в остросюжетном сериале "Экстрадиция-2" (Польша). Д-16. 1-я серия.
17.55 Барбара Брыльска и Ян Новицкий в психологической драме "Анатомия любви" (Польша). Д-13.
19.20 КиНовости.
19.30 Стивен Ланг и Дженнифер Джейсон Ли в фильме Ули Эделя "Последний поворот на Бруклин" (ФРГ - США). Д-17.
21.10 Анзак Уоллес и Бруно Лоуренс в историческом фильме Джеффа Мерфи "Уту" (Новая Зеландия). Д-13.
22.50 КиНовости.
23.00 - 0.35 Скотт Бакула, Челси Филд и Шейла Келли в триллере "Принцип одержимости" (США). Д-17.

СПОРТ

9.00 Пресс-центр
9.15 Аэробика
9.40 Урок шахмат
9.55 Хроника недели
10.25 Хоккей. Международный турнир Кубок Спартака. Матч за 3-е место
12.25 Аэробика
12.50 Пресс-центр
13.00 На чемпионате мира по легкой атлетике
13.30 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
14.00 Железный фактор". Тележурнал
14.30 Кто они чемпионы?.- Тележурнал
15.00 Пресс-центр
15.10 Урок шахмат
15.25 Теннисные хиты в исполнении звезд
16.20 Хоккей. Международный турнир Кубок Спартака. Финал.
18.20 Пресс-центр
18.30 На чемпионате мира по легкой атлетике
19.00 "Звездный вторник"
20.00 Пресс-центр
20.20 Программа передач на завтра
20.25 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
20.55 По всем правилам. Спортивный тотализатор
21.05 Международный турнир по спортивной и художественной гимнастике Новгород Великий-99
22.05 Удивительные игры народов мира. Новая Зеландия
23.00 Пресс-центр. На чемпионате мира по легкой атлетике
23.20 Новости

Серада, 25

НАШЕ КИНО

9.05 Сериал "Горячев и другие". 33-я серия. "Прошло время..."; 34-я серия. "Долгие платежи"; 35-я серия. "Предварительные итоги".
10.25 КиНовости.
10.35 Лекарство против стресса. Вера Васильева, Владимир Ушаков, Виталий Доронин и Татьяна Пельтцер в музыкальной комедии Татьяны Лукашевич и Бориса Равенских "Свадьба с приданым".
12.20 Звездный билет. Лариса Гузеева в мелодраме Эльдара Рязанова "Жестокий романс". 2 серии.
14.40 Черно-белое золото. Сериал "Семнадцать мгновений весны". 7-я серия.
15.50 КиНовости.
16.00 Черно-белое золото. Сериал "Семнадцать мгновений весны". 8-я серия.
17.05 Киноновелла "Close up".
17.20 Киносреда. "Слово для защиты". Леонид Филатов и Сергей Колтаков в психологическом детективе Инны Туманян "Соучастники".
19.00 Михаил Ульянов, Кирилл Ларов и Андрей Мягков в киноромане Ивана Пырьева "Братья Карамазовы". 1-я серия.
20.20 КиНовости.
20.30 Кинокалендарь. Режиссер Сергей Соловьев. Татьяна Друбич, Александр Абдулов, Михаил Розанов, Александр Збруев и Людмила Савельева в кинофарсе Сергея Соловьева "Черная роза - эмблема печали, красная роза - эмблема любви".

МИР КИНО

9.35 Марек Кондрат, Малгожата Печиньска в остросюжетном сериале "Экстрадиция-2" (Польша). Д-16. 1-я серия.
10.30 Скотт Бакула, Челси Филд и Шейла Келли в триллере "Принцип одержимости" (США). Д-17.
12.05 КиНовости.
12.15 Барбара Брыльска и Ян Новицкий в психологической драме "Анатомия любви" (Польша). Д-13.
13.40 Стивен Ланг и Дженнифер Джейсон Ли в фильме Ули Эделя "Последний поворот на Бруклин" (ФРГ - США). Д-17.
15.20 Анзак Уоллес и Бруно Лоуренс в историческом фильме Джеффа Мерфи "Уту" (Новая Зеландия). Д-13.
17.05 Марек Кондрат, Малгожата Печиньска в остросюжетном сериале "Экстрадиция-2" (Польша). Д-16. 2-я серия.
18.00 КиНовости.
18.10 Дон "Дракон" Уилсон в боевике Дэмиана Ли "Последний бросок" (США). Д-17.
19.40 Стефан Гютлер, Брунхильда Клокнер и Фолкер Пехтель в исторической драме Вернера Херцога "Стеклянное сердце" (ФРГ). Д-17.
21.15 Терри О'Квин и Тимоти Патрик Кевено в фантастическом боевике Ламара Карда "Техносапиенс" (США). Д-17.
22.45 КиНовости.
22.55 - 0.25 Трэйси Лордс и Трой Донахью в мистическом триллере Марка Фрида "Бей насмерть" (США). Д-17.

СПОРТ

9.00 Пресс-центр
9.15 Аэробика
9.40 Урок тенниса
9.55 Звездный вторник
11.00 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
11.30 Аэробика
11.55 Хоккей. Международный турнир памяти И.Х. Ромазана. Торпедо (Ярославль)- Ак Барс (Казань). Прямая трансляция из Магнитогорска. В первом перерыве(12.35)-Пресс-центр
14.30 Пресс-центр
14.40 На чемпионате мира по легкой атлетике
15.10 Урок тенниса
15.25 Хоккей. Международный турнир памяти И.Х. Ромазана. Металлург(Магнитогорск)- Лион (Франция)). Прямая трансляция из Магнитогорска
18.00 Пресс-центр
18.10 На чемпионате мира по легкой атлетике
18.45 По всем правилам. Спортивный тотализатор
19.00 Бокс. Чемпионат мира. Полуфиналы. Прямая трансляция из США
22.30 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
23.00 Пресс-центр. На чемпионате мира по легкой атлетике
23.20 Новости

Чацвер, 26

НАШЕ КИНО

9.05 Михаил Ульянов, Кирилл Лавров, и Андрей Мягков в киноромане Ивана Пырьева "Братья Карамазовы". 1-я серия.
10.20 КиНовости.
10.30 Татьяна Друбич, Александр Абдулов, Михаил Розанов, Александр Збруев и Людмила Савельева в кинофарсе Сергея Соловьева "Черная роза - эмблема печали, красная роза - эмблема любви".
12.45 Эксцентрическая комедия Александра Довженко "Ягодка любви".
13.10 "Дело №..." Леонид Филатов и Сергей Колтаков в психологическом детективе Инны Туманян "Соучастники".
14.45 Черно-белое золото. Сериал "Семнадцать мгновений весны". 8-я серия.
15.50 КиНовости.
16.00 Черно-белое золото. Сериал "Семнадцать мгновений весны". 9-я серия.
17.20 Тийт Хярм, Илзе Лиепа и Павел Кадочников в фантастическом фильме Булата Мансурова "Блистающий мир".
18.45 Елена Цыплакова в киноповести Александра Панкратова "Счастливая, Женька!"
20.05 Михаил Ульянов, Кирилл Лавров, и Андрей Мягков в киноромане Ивана Пырьева "Братья Карамазовы". 2-я серия.
21.15 КиНовости.
21.25 Сергей Никоненко, Михаил Козаков, Владимир Грамматиков и Михаил Пуговкин в приключенческом фильме Самвела Гаспарова "Шестой".

МИР КИНО

9.35 Марек Кондрат, Малгожата Печиньска в остросюжетном сериале "Экстрадиция-2" (Польша). Д-16. 2-я серия.
10.30 Трэйси Лордс и Трой Донахью в мистическом триллере Марка Фрида "Бей насмерть" (США). Д-17.
12.05 КиНовости.
12.15 Дон "Дракон" Уилсон в боевике Дэмиана Ли "Последний бросок" (США). Д-17.
13.45 Стефан Гютлер, Брунхильда Клокнер и Фолкер Пехтель в исторической драме Вернера Херцога "Стеклянное сердце" (ФРГ). Д-17.
15.15 Терри О'Квин и Тимоти Патрик Кевено в фантастическом боевике Ламара Карда "Техносапиенс" (США). Д-17.
16.45 Клаудио Фьори Ченчиони и Франческо Ченчиони в драме Эторе Сколы "Сорок третий - девяносто седьмой" (Италия). С.
17.00 Марек Кондрат, Малгожата Печиньска в остросюжетном сериале "Экстрадиция-2" (Польша). Д-16. 3-я серия.
17.55 КиНовости.
18.05 Билли Блэнкс, Джалал Мери и Вулф Ларсон в боевике Зейла Дэйлена "Пощады не будет" (США). Д-17.
19.40 Сэм Нил и Зое Каридес в криминальной драме Джона Руана "Смерть в Брунсвике" (Австралия). Д-17.
21.25 Майкл МакНамара, Мартин МакНамара и Б.Боб в приключенческом боевике Чарльза Виннера "Охота на дракона" (Канада). Д-13.
22.55 КиНовости.
23.05 - 0.30 Ноэль Питерс и Мелиса Мур в фильме ужасов Рифа Кугана "Маньяк-невидимка" (США). Д-17.

СПОРТ

9.00 Пресс-центр
9.15 Аэробика
9.40 Урок кунг-фу
9.55 Бокс. Чемпионат мира. Полуфиналы. Передача из США
13.25 Пресс-центр
13.35 На чемпионате мира по легкой атлетике
14.05 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
14.35 Боулинг. Золотой Кубок России
15.05 Викторина Бэна Уайдера по бодибилдингу
15.15 Пресс-центр
15.25 Хоккей. Международный турнир памяти И.Х. Ромазана. Ак Барс(Казань)- Металлург (Магнитогорск). Прямая трансляция из Магнитогорска
18.00 Пресс-центр
18.10 На чемпионате мира по легкой атлетике
18.40 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
19.10 Программа передач на завтра
19.15 Пресс-центр
19.25 Бокс. Чемпионат мира. Полуфиналы. Передача из США
23.00 Пресс-центр. На чемпионате мира по легкой атлетике
23.20 Новости

Пятніца, 27

НАШЕ КИНО

9.05 Михаил Ульянов, Кирилл Лавров, и Андрей Мягков в киноромане Ивана Пырьева "Братья Карамазовы". 2-я серия.
10.15 КиНовости.
10.25 Сергей Никоненко, Михаил Козаков, Владимир Грамматиков и Михаил Пуговкин в приключенческом фильме Самвела Гаспарова "Шестой".
11.45 Тийт Хярм, Илзе Лиепа и Павел Кадочников в фантастическом фильме Булата Мансурова "Блистающий мир".
13.10 Елена Цыплакова в киноповести Александра Панкратова "Счастливая, Женька!"
14.30 Черно-белое золото. Сериал "Семнадцать мгновений весны". 9-я серия.
15.50 КиНовости.
16.00 Черно-белое золото. Сериал "Семнадцать мгновений весны". 10-я серия.
17.10 "Дело №..." Михаил Чигарев, Инна Аленикова и Александр Пороховщиков в детективной киноповести Вячеслава Максакова "Город принял".
18.25 К юбилею Владимира Ивашова. Семен Морозов и Владимир Ивашов в комедии Ролана Быкова "Семь нянек".
19.40 КиНовости.
19.50 Михаил Ульянов, Кирилл Лавров, и Андрей Мягков в киноромане Ивана Пырьева "Братья Карамазовы". 3-я серия.
21.00 "Обратная точка". Роман Балаян. "Две луны, три солнца".
21.15 Из коллекции канала "Наше кино". Владимир Машков, Елена Шевченко, Константин Степанков и Ада Роговцева в кинодраме Романа Балаяна "Две луны, три солнца".

МИР КИНО

9.35 Марек Кондрат, Малгожата Печиньска в остросюжетном сериале "Экстрадиция-2" (Польша). Д-16. 3-я серия.
10.30 Ноэль Питерс и Мелиса Мур в фильме ужасов Рифа Кугана "Маньяк-невидимка" (США). Д-17.
11.55 КиНовости.
12.05 Билли Блэнкс, Джалал Мери и Вулф Ларсон в боевике Зейла Дэйлена "Пощады не будет" (США). Д-17.
13.40 Сэм Нил и Зое Каридес в криминальной драме Джона Руана "Смерть в Брунсвике" (Австралия). Д-17.
15.30 Майкл МакНамара, Мартин МакНамара и Б.Боб в приключенческом боевике Чарльза Виннера "Охота на дракона" (Канада). Д-13.
17.00 Марек Кондрат, Малгожата Печиньска в остросюжетном сериале "Экстрадиция-2" (Польша). Д-16. 4-я серия.
17.55 КиНовости.
18.05 Рассел Вон в боевике Ронни Ю "Белый Китай" (Гонконг). Д-13.
19.40 Фабрис Лукини, Морис Геррель и Жудит Анри в мелодраме Кристиана Винсана "Скромница" (Франция). Д-17.
21.10 Майкл Парэ, Линда Хоффман и Энтони Фриджон в боевике Йосси Вейна "Торговец смертью" (США). Д-13.
22.50 КиНовости.
23.00 - 1.35 Керри Фокс в биографической драме Джейн Кэмпион "Ангел за моим столом" (Новая Зеландия). Д-17.

СПОРТ

9.00 Пресс-центр
9.15 Аэробика
9.40 Урок волейбола
9.55 Бокс. Чемпионат мира. Финалы. Передача из США
12.20 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
12.50 Пресс-центр
13.00 На чемпионате мира по легкой атлетике
13.30 Водно-моторный спорт. Гран-При России в классе Формула-500 и Формула-4. Передача из Санкт-Петербурга
15.00 Пресс-центр
15.10 Урок волейбола
15.25 Хоккей. Международный турнир памяти И.Х.Ромазана. Металлург(Магнитогорск)-Торпедо(Ярославль). Прямая трансляция из Магнитогорска
18.00 Пресс-центр
18.10 Тайский бокс
19.05 На чемпионате мира по легкой атлетике
19.35 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
20.05 Пресс-центр
20.15 Программа передач на завтра
20.20 По всем правилам. Спортивный тотализатор
20.30 Бокс. Чемпионат мира. Финалы. Передача из США
23.00 Пресс-центр. На чемпионате мира по легкой атлетике
23.20 Новости

Субота, 28

НАШЕ КИНО

9.05 Кинокалендарь. Актеры Владимир Ивашов. Семен Морозов и Владимир Ивашов в комедии Ролана Быкова "Семь нянек".
10.20 "Дело №..." Михаил Чигарев, Инна Аленикова и Александр Пороховщиков в детективной киноповести Вячеслава Максакова "Город принял".
11.35 Михаил Ульянов, Кирилл Лавров, и Андрей Мягков в киноромане Ивана Пырьева "Братья Карамазовы". 3-я серия.
12.45 "Обратная точка". Роман Балаян. "Две луны, три солнца".
13.00 Из коллекции канала "Наше кино". Владимир Машков, Елена Шевченко, Константин Степанков и Ада Роговцева в кинодраме Романа Балаяна "Две луны, три солнца".
14.30 Наталья Гундарева, Борис Плотников и Армен Джигарханян в музыкальном фильме Светланы Дружининой "Дульсинея Тобосская". 2-я серии.
16.45 Мультфильм "Букет".
17.00 Лекарство против стресса. Евгений Леонов и Вячеслав Невинный в комедии Леонида Гайдая "За спичками" (СССР - Финляндия).
18.35 "Дело №..." Валерий Золотухин и Владимир Высоцкий в детективе Владимира Назарова "Хозяин тайги".
19.55 Марафон премьер на канале "Наше кино". Ирина Розанова, Михаил Кокшенов и Борис Щербаков в комедийной мелодраме Анатолия Эйрамджана "Когда все свои".
21.00 Из коллекции канала "Наше кино". Сергей Никоненко, Юозас Будрайтис, Валентина Теличкина, Владимир Этуш, Александр Панкратов-Черный и Алексей Гуськов в триллере Георгия Шенгелия "Классик".

МИР КИНО

9.35 Марек Кондрат, Малгожата Печиньска в остросюжетном сериале "Экстрадиция-2" (Польша). Д-16. 4-я серия.
10.30 Керри Фокс в биографической драме Джейн Кэмпион "Ангел за моим столом" (Новая Зеландия). Д-17.
13.05 Рассел Вон в боевике Ронни Ю "Белый Китай" (Гонконг). Д-13.
14.40 Фабрис Лукини, Морис Геррель и Жудит Анри в мелодраме Кристиана Винсана "Скромница" (Франция). Д-17.
16.10 Майкл Парэ, Линда Хоффман и Энтони Фриджон в боевике Йосси Вейна "Торговец смертью" (США). Д-13.
17.50 Нино Манфреди и Франсуаза Фабьян в детективном сериале "Комиссар в Риме" (Италия). Д-12. 5-я серия. "Служебные тайны".
18.55 На Диком Западе мира кино. Дэн Хаггерти и Джон Кристиан в вестерне "Маленький патриот" (США). С.
20.25 Марк Дакаскос и Кадим Хардисон в фантастическом боевике Стива Ванга "Драйв" (США). Д-17.
22.05 Жан-Поль Бельмондо в детективе Жоржа Лотнера "Кто есть кто" (Франция). Д-17.
23.50 - 1.40 Мел Гибсон в драме "Человек без лица" (США). Д-13.

СПОРТ

9.00 Пресс-центр
9.15 Аэробика
9.40 Бокс. Чемпионат мира. Финалы. Передача из США
11.55 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
12.25 Аэробика
12.50 Пресс-центр
13.00 На чемпионате мира по легкой атлетике
13.30 Утомленные ветром. Последняя кругосветная парусная гонка столетия. Часть 1-я
14.30 Звездный вторник (повтор от 24 августа)
15.30 Пресс-центр
15.40 Викторина Бэна Уайдера по бодибилдингу
15.45 Пляжный волейбол. Этап мировой серии в Москве
16.15 Спортивные танцы. Гран-При по латиноамериканским танцам среди профессионалов. Передача из Омска
17.20 Гольф.Тележурнал
17.50 По всем правилам. Спортивный тотализатор
18.00 Кто они чемпионы?. Тележурнал
18.30 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
19.00 Пресс-центр
19.15 На чемпионате мира по легкой атлетике
19.45 Бокс. Чемпионат мира. Финалы. Передача из США
22.00 "Спорт-коктейль"
22.30 Came Throphy. Естественный отбор
23.00 Пресс-центр. На чемпионате мира по легкой атлетике
23.20 Гольф.Тележурнал

Нядзеля, 29

НАШЕ КИНО

9.05 Наталья Гундарева, Борис Плотников и Армен Джигарханян в музыкальном фильме Светланы Дружининой "Дульсинея Тобосская".
11.20 Лекарство против стресса. Евгений Леонов и Вячеслав Невинный в комедии Леонида Гайдая "За спичками" (СССР - Финляндия).
12.55 Из коллекции канала "Наше кино". Сергей Никоненко, Юозас Будрайтис, Валентина Теличкина, Владимир Этуш, Александр Панкратов-Черный и Алексей Гуськов в триллере Георгия Шенгелия "Классик".
14.35 Марафон премьер на канале "Наше кино". Ирина Розанова, Михаил Кокшенов и Борис Щербаков в комедийной мелодраме Анатолия Эйрамджана "Когда все свои".
15.40 "Дело №..." Валерий Золотухин и Владимир Высоцкий в детективе Владимира Назарова "Хозяин тайги".
17.00 Мультфильм "Когда-то давно..."
17.20 "Дело № ..." Валерий Золотухин в детективе Владимира Назарова "Пропажа свидетеля".
18.45 Лекарство против стресса. Станислав Любшин, Евгений Леонов и Юрий Яковлев в комедии Георгия Данелия "Кин-дза-дза!" 2 серии.
20.55 Галина Беляева, Олег Янковский, Кирилл Лавров и Леонид Марков в мелодраме Эмиля Лотяну "Мой ласковый и нежный зверь".

МИР КИНО

9.35 Нино Манфреди и Франсуаза Фабьян в детективном сериале "Комиссар в Риме" (Италия). Д-12. 5-я серия. "Служебные тайны".
10.35 На Диком Западе мира кино. Дэн Хаггерти и Джон Кристиан в вестерне "Маленький патриот" (США). С.
12.05 Календарь "Мира кино". Ричард Аттенборо.
12.15 Жан-Поль Бельмондо в детективе Жоржа Лотнера "Кто есть кто" (Франция). Д-17.
14.00 Мел Гибсон в драме "Человек без лица" (США). Д-13.
15.50 Марк Дакаскос и Кадим Хардисон в фантастическом боевике Стива Ванга "Драйв" (США). Д-17.
17.30 Нино Манфреди и Франсуаза Фабьян в детективном сериале "Комиссар в Риме" (Италия). Д-12. 6-я серия. "Без виновного".
18.30 Календарь "Мира кино". Ричард Аттенборо.
18.40 Мир киноприключений. Рутгер Хауэр в приключенческом фильме Питера Сватека "Зов предков" (Канада). С.
20.10 Джейсон Донован и Энджи Милликен в лирической комедии Доналда Кромби "Неограненные алмазы" (Австралия). С.
21.40 Рой Дюпюи в комедии Клода Фурнье "Орел и решка" (Канада). Д-17.
23.25 Питер Уэллер, Джуди Дэвис и Джулиан Сэндс в фантастической драме Дэвида Кроненберга "Обед нагишом" (Канада - Великобритания). Д-17.

СПОРТ

9.00 Пресс-центр
9.15 Аэробика
9.40 "Спорт-коктейль"
10.10 Хоккей. Международный турнир памяти И.Х.Ромазана. Металлург(Магнитогорск)-Торпедо(Ярославль)
12.20 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
12.50 Пресс-центр
13.00 На чемпионате мира по легкой атлетике
13.30 Утомленные ветром. Последняя кругосветная парусная гонка столетия. Часть 2-я
14.40 Пресс-центр
14.50 Соревнования сильнейших мастеров конного спорта в Тушино
17.00 Хоккейный вечер
17.45 Шахматы. Чемпионат мира ФИДЕ
18.15 Пресс-центр
18.30 На чемпионате мира по легкой атлетике
19.00 Большой ринг
21.00 "Еще неделя позади"
21.30 По всем правилам. Спортивный тотализатор
21.40 Кто они чемпионы?. Тележурнал
22.10 Вечер в парижском дворце спорта Берси. Роликовый спорт
23.00 Пресс-центр. На чемпионате мира по легкой атлетике
23.20 Новости

С - фильмы, рекомендованные для семейного просмотра.
Д-13 - фильмы, просмотр которых не рекомендован лицам моложе 13 лет.
Д-17 - фильмы, просмотр которых не рекомендован лицам моложе 17 лет.

РЭКЛАМА Тэлефон: (0152) 72-29-96, 72-37-14

ПРАДАЮ

БУС Фіат-Дуката грузавы, 90 г. в. Тэл. 918-410, 6-11-35.

ВАЗ-21061 87 г.в., рухавік пасля капрамонта, новая гума, аўтасігналіз, газ-бензін, аўтабагажнік; халадзільнік «Крышталь-408» б/у, амартызатары, камплекты да ВАЗ, Масквіча, катушку запальвання б/у, тармазныя дыскі заднія да ВАЗ, аўтарадыёпрыёмнік, электрарухавік 4 кВт 1000 абаротаў. Тэл. 33-43-71 (з 9.00 да 22.00).

Фіат-Уно 89 г. в., 5-дзверны, 5-КПП, люк, 1950 у. а. Тэл. у Ваўкавыску (8-212) 3-69-03.

Сеат-Малага 90 г. в., прабег 105 тыс. км, 2600 у.а. Тэл. у Ваўкавыску 4-47-80.

М-412 на запчасткі. Гараж металічны 2х3 без месца ў р-не ДАСААФ. Тэл. 39-93-09.

ВАЗ-01 77 г.в., колер «вішня», паліва А-76, у добрым стане, 650 у. а. Тэл. 6-34-83.

VW-Пасат, 1992 г.в., белага колеру, 1,8, бензін, гідраўзмацняльнік, люк, цэнтральны замок, 4700 у.а. Тэл. 72-62-09.

VW-Джэта, 1985 г.в., 1,6, бензін, чырвонага колеру, гідраўзмацняльнік, 2100 у.а. Тэл. 72-62-09.

ВАЗ-2103, 1987 г.в. Тэл. 47-36-20 (пасля 19.00).

Самаробны трактар. Тэл. 72-76-08.

Запчасткі да аўтамабіля Опель-Аскона, 1,3 у.а. Тэл. 31-21-06.

М-2140, запчасткі. Тэл. 72-33-80.

ЗАЗ-30 на запчасткі. Тэл. 33-62-62 (пасля 19.00, паклікаць Валерыя).

Матацыкл ІЖ-Юпіцер-5 90 г. в, светладынамічнае прыстасаванне «Гама». Тэл. (01512) 35-7-88.

Байдарку «Таймень-2»; свідравальны станок; кіслародныя балоны; фотаапарат «Зенит». Тэл. у Слоніме 2-38-20.

КПП да Форд-Эскорт 5-ступенчатую, дызельную. Дакументы на Форд-Эскорт. Тэл. 2-80-51 (з 18.00 да 20.00).

Запчасткі да аўтамабіля Таўрыя. Тэл. 5-10-45.

Ахову для пярэдніх крылаў да ВАЗ-06; замок агульны для падвала (20 ключоў); мыйку эмаліраваную 2-секцыйную; кінакамеру «Кварц». Тэл. 6-79-47.

Паліўную помпу да КАМАЗа. Тэл. 33-93-37 (пасля 17.00).

Прычэпы да аўтамабіляў.
Тэл. 44-21-37, 72-30-27.

Танна: матацыкл ІЖ, запчасткі да Масквіча-2140, новую паршнявую (на бензін А-76). Тэл. 31-98-61.

Пярэднія дзверы правыя да ВАЗ-21061, панэль пад глушыцель, марылку. Тэл. 72-92-70.

Гараж металічны 3х3. Танна. Тэл. 6-28-02.

Ці здаю гараж за Ласосна, 600 у.а. Тэл. 2-00-78.

1/2 дома ў цэнтры Гродна (камунікацыі, 10 сотак). Прапанаваць варыянты. Тэл. 79-59-87.

Дачны ўчастак (5 км ад Парэчча Гарадзенскага р-на), ёсць пабудовы. Кошт па дамоўленасці. Тэл. (8-263) 2-16-30.

2-пакаёвую кватэру з усімі выгодамі, агульная плошча - 42 кв.м, карысная плошча - 28 кв.м, чацвёрты паверх, балкон у пас. Гезгалы Дзятлаўскага раёна. Тэл. у Гродне 2-92-08.

3-пакаёвую кватэру новай планіроўкі па вул. Горкага. Тэл. 44-22-94.

Газавую калонку. Тэл. 31-74-24.

Кацёл для лазні. Тэл. 6-01-59.

Кухню новую «Крынічка». Тэл. 2-49-01.

Кухню імпартную б/у; маленькую канапу; пральную машыну «Мара»; новую батарэю імпартную на 10 рэбраў. Тэл. 31-24-73.

Кухонны вугалок, разны з натуральнага дрэва. Тэл. 99-76-50.

М/м, крэсла-ложак, усё б/у і танна; масляны радыятар; эл. пралку. Тэл. 6-29-48.

Крэсла-ложак і палутараспальны ложак. Тэл. 72-60-70.

2-спальны ложак; штангу, гантэлі; бочкі металічныя і пластыкавыя; магнітафон бабінны. Тэл. 31-86-20.

Тэлевізар «Славуціч Ц-208» ч/б у добрым стане, 12 млн. руб. Тэл. 6-66-34.

Кларнет чэшскі, в/м «Шарп», 7-галовачны, танна, акардэон «Ferotti». Тэл. 31-15-83 (у любы зручны час).

Магнітафон «Беларусь» - 5 мільёнаў рублёў; фотаапарат «Зеніт-Е» 5 мільёнаў рублёў. Тэл. 72-85-83.

Дошку абразную сухую, 40 мм. Тэл. 993-315.

Аконна-балконны зашклёны блок шыр. 1,5 м; 2-восны аўтапрычэп. Тэл. 74-22-97, 72-56-03.

Дзіцячую каляску-тройку б/у. Тэл. 78-42-52.

Дзіцячы веласіпед «Нёман-4», танна. Тэл. 47-18-21.

Паліто жаночае, дэмісезоннае, кароткае, памер 170-92-100, новае, танна. Тэл. 44-26-24 (да 18.00).

Літаратуру па будаўнічаму праектаванню і будаўніцтву, у тым ліку падручнікі, даведнікі для навучэнцаў тэхнікумаў, інстытутаў. Тэл. 72-16-55.

Акварыум на 100 літраў з прыналежнасцямі; музычны цэнтр «Рамантыка-201-стэрэа» і каляровы кінескоп 61 Лк4Ц. Тэл. 47-00-16.

Лінолеум 13 кв. м. для станд. 3-пакаёвай кватэры, танна; Масквіч-412 88 г.в. Тэл. 5-49-87.

Карову і цяля. Звяртацца: Гарадзенскі р-н, в. Баля-Сольная, д. 1.

Карову (3 гады), добры ўдой - 15-18 літраў. Тэл. 31-90-70.

КУПЛЮ

Разцы па дрэву (набор). Тэл. (8-251) 2-29-14.

Новы халадзільнік «Атлант», пыласос, двухкасетнік, рамень крокавы на універсальную шынкоўку-бульбацёрку, можна б/у; кухонную шафу для посуду. Тэл. 33-43-71 (з 9.00 да 22.00).

Рухавік да ВАЗ, блок да ВАЗ-03, патрабуюцца дакументы на ВАЗ-06; электраводанагравальнік. Тэл. 993-315.

Металічны вугалок, сталь ліставую; зямельны ўчастак. Тэл. 47-05-08.

Акардэон. Тэл. 2-92-08.

МЯНЯЮ

3-пакаёвую кватэру с/п па вул. Курчатава на 2-пакаёвую кватэру (24 кв. м) с/п плюс даплата. Тэл. 31-93-49 (пасля 18.00).

3-пакаёвую кватэру ў цэнтры Ваўкавыска (карысная плошча 43 кв. м, дзве лоджыі, пакоі асобныя, дом цагляны) на 2-пакаёвую ці 1-пакаёвую ў Гродне. Тэл. у Ваўкавыску 2-29-08.

Гараж па вул. Паповіча на аўтамабіль Аудзі-80 не старэй 87 г. в. Звяртацца: Гродна, вул. Паповіча, 19-2.

ПАСЛУГІ

Беларуская мова, пераклады. Тэл. 33-47-56.

Зварка, рыхтоўка, рамонт рухавікоў, падрыхтоўка да продажу. Тэл. 5-02-89.

Ангельская мова: пераклады, кантрольныя (акрамя рэпетытарства). Тэл. 31-15-83.

Урокі класічнай ігры на гітары: ад прасцейшага акампанемента да класічнага выканання твораў сярэдняй цяжкасці на базе азнаямлення з асновамі элементаў тэорыі музыкі ды музычнай гармоніі. Тэл. 72-16-55.

Ангельская і нямецкая мовы: пераклады, рэпетытарства. Тэл. 6-12-71.

Дапамагу студэнтам у рашэнні задач і выкананні кантрольных, курсавых і дыпломных праектаў па фізіцы; тэарэтычнай, тэхнічнай і будаўнічай механіцы; супраціўленню матэрыялаў; архітэктуры; любым будаўнічым канструкцыям пры ўмове своечасовага звароту на нумар тэлефона 72-16-55.

Рамонт пыласосаў усіх тыпаў з гарантыяй. Тэл. 6-45-74.

Кантрольныя работы, пераклады па ангельскай мове. Тэл. 47-89-56 (з 14.00 да 17.00).

Эфектыўнае ачышчэнне касмічнай энергіяй індывідуальна пры расстройствах унутраных органаў, нервовых ды інш. Зняцце сурокаў, страху, стварэнне пазітыўных установак выхаду з крызісу. Танна. Звяртацца: Дом афіцэраў, кабінет 20 з 12 па 25 жніўня з 10.00 да 14.00, акрамя панядзелка і аўторка. Пасведчанне аб рэгістрацыі Гарадзенскага аблвыканкама за N 400 ад 21.11.96 года.

УЗІ ўнутраных органаў, вызначэнне цяжарнасці. Ліц.N393, выдадзеная МЗ РБ да 2002 г. Тэл. 47-34-08, 72-18-00.

РОЗНАЕ

Вазьму ў добрыя рукі шчаня для жыцця на падворку (малая парода). Тэл. 5-49-87.

7 жніўня прапаў маленькі чорны сабачка з гладкай поўсцю, кароткім хвастом. Злева - шрам з сівізной. Вялікая просьба патэлефанаваць на нумар 6-21-22.

Слесар КІПіА 8-га разраду (40 гадоў) шукае працу. Тэл. 31-90-70.

Нямецкая сям'я запрашае дзяўчыну 18-24 гадоў нянькай. Ад Вас: аўтабіяграфія, фотакартка. Звяртацца: 220022, г. Менск, а/с 270.

Дагляджу адзінокую жанчыну за ўнаследаванне жылля. Пра сябе: 43 гады, каталічка. Звяртацца: 230009, г.Гродна, да запатрабавання, п/п КН 0328139.

Таталітарная дзяржава - як той здыхлявы парсюк у бабулькі. Яна яго ледзь корміць, а яму здаецца, што ўсё навокал толькі для яго. Калі ж настае час скону, парсюк нема крычыць і моцна б'ецца. Але канец наканаваны. Вячаслаў Мілкоўскі, г. Менск.

Патрабуюцца вартаўнікі. Тэл. 44-21-37, 44-53-97.

Шчыра запрашаем у Евангелісцкую Царкву на адрас: 2-і завулак Іўліева, 4 (раён вуліцы Сухамбаева). Пятніца - у 18.30; нядзеля -у 10.00 і 18.00. Тэл. 39-99-26.

Слухайце кожны дзень хрысціянскія радыёперадачы:
6.00-8.00 - 31 м;
6.30-7.30 - 25 м;
16.40 - 25, 31 м;
21.00 - 25, 31 м;
Р-1 - 16.45, 18.30.

ЗНАЁМСТВЫ

Шукаю сяброўку жыцця. Пра сябе: 54-гадовы ўдавец, пенсіянер, шчуплы, сярэдняга росту, молада выглядаю, без сямейных абавязкаў і гаспадаркі (ёсць агарод), жыхар вёскі (40 км ад Беластока). Пазнаёмлюся з праваслаўнай удавой 40-50 гадоў, якая не курыць, не п'е. Пісаць: Bazyli Jakoniuk, Dawidowicze 11, 16-064, Ryboty.

Паляк, які пражывае на поўдні Польшчы, 60 гадоў, вышэйшая адукацыя, матэрыяльна добра забяспечаны, пазнаёміцца з сумленнай адзінокай жанчынай у матрыманіяльных мэтах. Спадарыня можа жыць у мяне ў Польшчы або магу пераехаць да яе. Прашу пісаць мне па-польску, або пропіссю па-руску. Лісты дасылаць у рэдакцыю з прыпіскай АДЗІНОКАМУ.

Беластачанін, па знаку Задыяка - Леў, 55 гадоў, матэрыяльна забяспечаны, пазнаёміцца з праваслаўнай жанчынай адпаведнага ўзросту. Лісты дасылаць у рэдакцыю з прыпіскай «ЛЕЎ».

Яўген, 38 гадоў, стройны кавалер з Беластоцкай вёскі, гаспадар, пазнаёміцца з разумнай беларускай. Лісты дасылаць у рэдакцыю.

Жыццё не ўладкавалася. Але кажуць, што ў 40 гадоў яно толькі пачынаецца. Шукаю жанчыну, з якой я падзяліў бы смутак і каханне. Веру: Ты - дзесьці побач. Пішы, я буду чакаць. Пісаць: Віцебская вобл, г. Глыбокае, п/с 15/13-21. Васілю Сцяпанавічу Касцевічу.

Жанчына, 46/170, в/а, разведзеная, для сур'ёзных адносінаў і стварэння сям'і пазнаёміцца з прыстойным надзейным мужчынам адпаведнага ўзросту, які стаміўся ад адзіноты. Тэлефон паскорыць сустрэчу. Пісаць: 230010, г. Гродна-10, а/с 30.

Пазнаёмлюся з самастойным добрым мужчынам 30-35 гадоў. Пра сябе: 34 гады, рост 165, замужам не была, жыву ў вёсцы з бацькамі. Фота абавязкова. Пісаць: 222418, Менская вобл. Вілейскі р-н, п/а Нарач, в. Папоўцы, Ірыне Дурэйка.

Шукаю сяброў, неабыякавых да жыцця і якія вераць у дабрыню і каханне. Тэл. 44-40-80.

Пазнаёмлюся са стройным мужчынам 40-47 гадоў ростам 170-178, які не курыць і мае месца для сустрэчаў. Пісаць: 230026, г.Гродна, да запатрабавання, п/п КНО156796.

20 жніўня

80 гадоў таму (1919 г.) памёр **Іван Луцкевіч**, грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст, краязнаўца, археолаг, празаік. Нарадзіўся 28 траўня 1881 года ў Шаўлях, што на Ковеншчыне. З 1890 года пачаў вучыцца ў Лібаўскай гімназіі, пасля пераезду сям'і - у Менску. У 1902 годзе паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, адначасова вучыўся ў археалагічным інстытуце. Пазней быў накіраваны на вучобу ў Вену. Актыўна ўдзельнічаў у грамадска-палітычным жыцці. Пад пагрозай арышту ў пачатку 1906 года быў вымушаны выехаць з Менску ў Вільню, дзе знаходзіўся на нелегальным становішчы да 1908 года. Па яго ініцыятыве былі заснаваны газеты «Наша доля» і «Наша ніва», а таксама кнігавыдавецкія суполкі. У 1915 годзе разам з Цёткай стварыў нацыянальныя настаўніцкія курсы і адчыніў пяць пачатковых школаў. Займаўся зборам музейных каштоўнасцяў, у 1916 годзе заснаваў газету «Гоман». У пачатку 1918 года стварыў у Вільні Беларускае навуковае таварыства, якому перадаў усе свае калекцыі. У 1919 годзе па ініцыятыве Івана Луцкевіча была створана першая беларуская гімназія, выкладаў там краязнаўства і беларусазнаўства. У сярэдзіне чэрвеня 1919 года выехаў на лячэнне ў Закапаны (Польшча), дзе і памёр. У 1991 годзе перахаваны на могілках Роса ў Вільні.

21 жніўня

125 гадоў таму (1874 г.) нарадзіўся **Уладзімір Беняшэвіч**, гісторык царкоўнага права, візанцініст, палеограф, акадэмік Страсбургскай, Берлінскай, Мюнхенскай АН. Нарадзіўся ў горадзе Друя Дзісенскага павета (цяпер Браслаўскі р-н). Вучыўся ў Пецярбургу, Лейпцыгу, Берліне, Гейдэльбергу. Працаваў у замежных бібліятэках, вывучаў старажытныя рукапісы. Асноўную частку жыцця працаваў у Пецярбургу. Неаднаразова арыштоўваўся. У 1938 годзе разам з сям'ёй быў расстраляны камуністычнымі ўладамі.

95 гадоў таму (1904 г.) у Гродне прайшла дэманстрацыя супраць руска-японскай вайны.

24 жніўня

255 гадоў таму (1744 г.) у Гродне прайшоў павятовы соймік. На ім паслам на варшаўскі сойм быў дадзены наказ пра захаванне права «ліберум вета».

Падрыхтаваў Уладзімір Хільмановіч

Гарадзенскі ўікэнд

Гісторыка-археалагічны музей. Стары замак. Выстава мастацкай фатаграфіі мастака са Швейцарыі Дэрэка Слэтэра. **Новы замак. Сенатарская зала.** Працяг выставы, прысвечанай Вялікай Айчыннай вайне: жывапіс, інсталяцыя, дакументы. Авальная зала. Выстава са шклозавода «Нёман» Людмілы Мягковай пад назвай «Шкло і вобраз».

Галерэя «Тызенгаўз» (пл. Тызенгаўза, 4). Выстава Вікенція Таркоўскага; жывапісны пейзаж. Працяг зборнай выставы гарадзенскіх мастакоў і скульптараў: Панцялееў, Якавенка, Стратовіч, Таркоўскі ды іншыя.

Галерэя «У майстра» (вул Кірава, 14). Выстава-продаж твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і карцінаў гарадзенскіх майстроў.

Музей Гісторыі Гарадніцы (вул. Ажэшкі, 37). Працяг выставы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва навучэнцаў Палаца дзіцяча-юнацкай творчасці пад назвай «Маладыя парасткі. Дрэва рамёстваў».

Выставачная зала Саюза мастакоў. Выстава твораў горадабудаўніцтва (эскізы, макеты) архітэктара Уладзіміра Еўдакімава.

Галерэя «Раскоша» (вул. Ажэшкі, 39а). Перапынак у працы да верасня.

Цэнтр народнай творчасці (Савецкая,8). Выстава традыцыйнага рамяства Гарадзеншчыны. Выстава вырабаў народнага майстра Яўгена Шведава «Тры жыцці дрэва». Вырабы з дрэва: хатняе начынне, сувеніры, дробязі.

Дом мастацкай і тэхнічнай творчасці моладзі (Замкавая,13). Выстава вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва навучэнцаў спецыяльных прафесійных установаў Гарадзеншчыны.

Газета ПАГОНЯ
Запрашае на працу
пенсіянераў, студэнтаў, школьнікаў і часова непрацуючых - для распаўсюджвання нашай газеты!
Тэл. 72-37-14, 72-29-96

ПАГОНЯ купон прыватнай аб'явы

51 Імя і прозвішча ____________________

Адрас (тэлефон) ____________________

Рубрыка ____________________

Тэкст ____________________

____

____

Аб'явы, дасланыя на купонах, друкуюцца ў першую чаргу; неразборліва напісаныя аб'явы не друкуюцца

Купон з тэкстам адпраўце па пошце на адрас: 230025, г. Гродна, вул. К. Маркса, 11

Зялёна-шэрая нудота

«Нёман-Белкард» - «Маладэчна» - 0:0

«Нёман»: ***Рыбак (галкіпер), Драчылоўскі (правы абаронец, капітан), Раўнейка (лібера), Пятроў (пярэдні абаронец), Крыванос (левы абаронец), Тупіцкі (правы паўабаронец), Кірэня (апорны паўабаронец, яго замяніў Маміда), Надзіеўскі (левы паўабаронец, Палякоў), Барысейка (пад нападнікамі), Мазурчык (форвард, Тарашчык), Радушка (форвард).***

Сустрэча пакінула змрочнае ўражанне. Даўно не даводзілася назіраць такую «мёртвую» гульню з абодвух бакоў. Матч навеяў сапраўдную зялёна-шэрую нудоту (маладэчанцы гулялі ў зялёных строях, нёманцы - у белых, але ад іх дзеянняў несла шэрасцю). Гасцей зразумець можна. Яны маюць зараз зусім новы склад. Плюс адсутнасць двух ключавых «цяжкіх фігураў» з-за дыскваліфікацыі (Дзмітрый Кабельскі і Сяргей Вайтовіч) і захварэўшага перспектыўнага форварда Яўсеенкі. Так што маладэчанцы (амаль безнадзейныя аўтсайдары нашага чэмпіянату) адчайна чапляліся за ачко. І ўрэшце свайго дамагліся. Што тычыцца «Нёмана», то склалася меркаванне, што сёння ён папросту не здольны гуляць «першым нумарам». За ўвесь першы тайм хваляванне па трыбунах прайшло толькі двойчы. У яго сярэдзіне пасля «свечкі» партнёра сеанс клаунады наладзіў брамнік Васілеўскі (летась выступаў за гарадзенцаў). А на 26-й хвіліне, пасля адпасоўкі Мазурчыка, прыстойна прабіў Барысейка - мяч прасвістаў паблізу стойкі.

У другой палове нёманцы карысталіся толькі прымітыўным навалам, хаця замены крыху дадалі ажыўлення. Тупіцкі праверыў на трываласць штангу. Пазней Рыбак ліквідаваў небяспечны контрвыпад (адзіны з боку «Маладэчна»). А на 65-й хвіліне госці ледзь не забілі сабе, але зрэзку Федаровіча па-гандбольнаму парыраваў Васілеўскі. І ўсё, нягледзячы на істэрычную падтрымку гледачоў, якіх схаманула спорыць дождж.

Пэўную цікавасць выклікаў прыезд двух былых фарвардаў менскага «Дынама» - Міхаіла Маркеля і Валерыя Вялічкі. Першы з іх зараз дапамагае ўратаваць маладэчанскі карабель у якасці гульца, а другі дэбютаваў у ролі галоўнага арбітра (кар'еру футбаліста Вялічка завяршыў заўчасна з-за сур'ёзнай траўмы). Па агульнаму прызнанню, са сваімі новымі абавязкамі Валерый справіўся належна.

Вынікі іншых матчаў 19-га тура: «Дынама» Бр. - «Тарпеда-Кадзіна» -4:0, «Днепр-Трансмаш» - «Тарпеда-МАЗ» - 1:0, «Дынама» Мн. -»Лакаматыў-96" - 4:0, «Шахцёр» - «Нафтан-Дэвон» - 5:2, «Славія» - »Гомель» - не адбыўся з-за моцнага дажджу, БАТЭ - «Свіслач-Дах» -2:0, «Белшына» - «Ліда» - 4:1 (чацвёртая запар параза лідчукоў!).

Турнірная табліца

1.	БАТЭ	50 ачкоў
2.	«Днепр-Трансмаш»	44
3.	«Гомель»	42
4.	«Славія»	38
5.	«Шахцёр»	35
6.	«Дынама» Бр.	32
7.	«Белшына»	29
8.	«Дынама» Мн.	29
9.	«Лакаматыў-96»	27
10.	«Нёман-Белкард»	27
11.	«Тарпеда-МАЗ»	21
12.	«Ліда»	14
13.	«Нафтан-Дэвон»	13
14.	«Тарпеда-Кадзіна»	12
15.	«Свіслач-Дах»	11
16.	«Маладэчна»	6

Хельмут Каменскі

Навічок-лідар

Неяк неспадзявана навічок першай лігі мастоўскі «Нёман», які сціпла пачаў сезон, з перадапошняга месца стаў упэўнена падымацца ў верх турнірнай табліцы. І ўжо некалькі тураў лідыруе ў першынстве рэспублікі.

У мінулым сезоне мастоўскія футбалісты з вялікімі цяжкасцямі дабіліся перахода ў першую лігу. Напачатку бягучага года каманду ўзначаліў новы трэнер Віктар Бублік. Ён прывёз з сабою дзесяць легіянераў. Многім мясцовым футбалістам, хто тэхнічна не адпавядаў узроўню гульца першай лігі, даваліся пакінуць каманду. Спачатку гэта выклікала нараканні заўзятараў, але, нягледзячы на ўсё гэта, каманда з кожным днём набірала майстэрства і ачкі. У апошнім туры чэмпіяната мастаўчане гулялі на выездзе з менскім клубам «Дынама-Юні», які прэтэндуе на адно з прызавых месцаў у чэмпіянаце, і перамаглі з лікам 0:1. Наступная сустрэча таксама вельмі важная. Мастаўчане прымаюць аднаго з лідараў турніра - слонімскі «Камунальнік».

Язэп Палубятка

Крыжакі сярод нас

У Вільні з вялікім поспехам экспанавалася карціна польскага жывапісца Яна Мацейкі «Грунвальдская бітва». З гэтай нагоды адбылося шмат сустрэчаў і размоваў, прысвечаных знакамітым карціне і бітве.

Бадай не самым цікавым стаў прыезд нямецкага барона Хайнца фон Хакенберга. Аказваецца, барон - сапраўдны член Ордэна крыжакаў, ушчэнт разбітага, як мы думалі, пад Грунвальдам амаль шэсцьсот гадоў таму! На самой справе Ордэн беспераапынна існуе і дзейнічае па сённяшні дзень, бо ніводзін Папа Рымскі яго ніколі не скасоўваў. Пасля Грунвальдскай бітвы галоўная стаўка Ордэна знаходзілася ў Палестыне, потым Напалеон перанёс яе ў Вену. Афіцыйная назва гэтай арганізацыі - Нямецкі Ордэн Прасвятой Дзевы Марыі. Зараз у Ордэне каля тысячы членаў-рыцараў. Ён мае парафіі ў Германіі, Аўстрыі, ЗША, Чэхіі, Бельгіі, Італіі, а з чэрвеня гэтага года з'явіўся і першы ксёндз-крыжак ў Таруні, у Польшчы.

Дэвіз Ордэна - «Быць і дапамагчы». Згодна з ім Ордэн мае свае шпіталі, прытулкі для састарэлых, аптэкі, лячэбніцы для наркаманаў, у якіх працуюць 260 сясцёр міласэрнасці. Такая старая арганізацыя (больш за 800 гадоў) здолела захаваць таму, што, спавядаючы вечныя ісціны, стварыла цалкам сучасную структуру. У мінулым годзе Ордэн наладзіў навуковую канферэнцыю ў Латвіі, а ў 2002 годзе правядзе яе ў Літве.

Яго светласць барон Хайнц фон Хакенберг паведаміў, чаму не засталося ніводнага нашчадка рыцараў, якія ўдзельнічалі ў бітве пад Грунвальдам. Гэта здарылася галоўным чынам таму, што рыцары былі манахамі і нашчадкаў пасля сябе, зразумела, не пакінулі.

Яго светласць пазабаўляўся, калі разглядаў знакамітую карціну. Паводле яго словаў, Вітаўт выяўлены чамусьці ў шапцы маскоўскага баярына, а ў руцэ трымае не баявы, а парадны меч. Такія мячы выкарыстоўваліся выключна для рэпрэзентацыяў святаў, палацавых прыёмаў, а таксама былі проста ўпрыгожваннем і для боя зусім не падыходзілі. Белы сцяг з чорным крыжом, які намаляваны за спіною Вітаўта, крыжакамі ніколі не выкарыстоўвайся і з'яўляецца выдумкай мастака.

Ну што ж, Ян Мацейка быў мастаком-рамантыкам. Таму як яму здавалася больш прыгожым, ён так і напісаў. А вось Ордэн крыжакаў, які існуе і сёння, - гэта і рамантыка, і канкрэтная багаўгодная справа.

Лявон Храптовіч

Заўтра ў нумары газеты:

Głos znad Niemna

- Лёс экс-міністра Леонава
- Вайна ў Дагестане
- У.Пуцін - паслядоўнік Андропава
- Ясір Арафат - бясклапотны шчаслівчык
- Мрангова - летняя сталіца крэсавай культуры
- Пакт Рыбентроп-Молатаў: як, чаму і супраць каго
- Землятрус у Турцыі

Па гарызанталі: 7. Шматгадовая травяністая расліна, якая расце ў ценістых вільготных месцах. 8. Патрэбы штодзённага жыцця. 10. Насельніцтва краіны. 11. Жэрдачка пад столлю ў сялянскай хаце. 12. Марка венгерскага аўтобуса. 14. Рака ў Беларусі і на Украіне. 16. Месяц у апошняй квадры. 17. Прыток Нёмана. 19. Пустазелле ў пасевах пшаніцы. 20. Літоўскі пісьменнік. 24. Такі мех, што не кожны падыме. 25. 16 старонак друкаванага тэксту. 26. Дваранства ў Польшчы. 30. Турэцкі пехацінец. 31. Хто едзе на транспарце? 32. Дымка, туман. 33. Па чым здымаюць кінафільм? 34. Прастора.

Па вертыкалі: 1. Што касіў Ясь, пагядаючы на дзяўчыну? 2. «Фардзон» як машына. 3. Выбар паміж карысным і шкодным. 4. Самая каларыйная пара рабочага дня. 5. Збор людзей з якой-небудзь мэтай. 6. Самы буйны з райцэнтраў Беларусі. 9. Фракароб. 13. Густа-чырвоны колер. 15. У назве рамана Івана Шамякіна яна глыбокая. 17. Нацыянальная балгарская гарэлка. 18. Раённы цэнтр у Віцебскай вобласці. 21. Храбрасць. 22. У яго ўстаўляюць папяросу. 23. Гатунак яблыні. 27. Рака на Віцебшчыне. 28. Возера ў Казахстане. 29. «Бюракратычная машына». 32. Прымітыўная барана (устар.).

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў нумары 50 (427)

Па гарызанталі: 7. Украінка. 8. Чыгрынаў. 10. Атоса. 11. Прашчур. 12. «Бульба». 14. Скалка. 16. Ганак. 17. Рона. 19. Азярод. 20. Пасада. 24. Паша. 25. Загад. 26. Бандыт. 30. Статак. 31. Артыкул. 32. Дыван. 33. Якімовіч. 34. Жамерыны.

Па вертыкалі: 1. Экстракт. 2. Вільчак. 3. Скнара. 4. Шыба. 5. Прысуд. 6. Забабоны. 9. Фосфар. 13. Талаш. 15. Лёзна. 17. «Радон». 18. Фофан. 21. Ластаўка. 22. Царква. 23. Цыбуліна. 27. Аўтаген. 28. Жаргон. 29. Кантар. 32. Дзік.

Дзевяць плюс адзін

Першыя дзевяць пытанняў з'яўляюцца своеасаблівым тэстам на ўзровень вашай эрудыцыі. Правільныя адказы на іх змешчаны ніжэй. На дзесятае пытанне конкурсу трэба адказаць пісьмова на адрас рэдакцыі (на паштоўках ці канвертах пазначыць - «9+1»). Сярод лістоў ды паштовак з правільнымі адказамі будзе праведзена лёсаванне, якое і вызначыць, хто ж стане пераможцам і атрымае прыз ад рэдакцыі нашай газеты.

1. Амазонкі (жанчыны-ваяўніцы ў грэчаскай міфалогіі) верылі, што лепшыя каханкі - ...

а) невідушчыя мужчыны;
б) глухія мужчыны;
в) кульгавыя мужчыны.

2. Гэтая амерыканская рака лічыцца калыскаю блюза. Называецца яна...

а) Місісіпі;
б) Амазонка;
в) Ніягара.

3. Гульня, у якой пяць гульцоў поліэтыленавымі клюшкамі спрабуюць забіваць мячык з таго ж поліэтылену ў маленькія вароты суперніка, мае назву...

а) інлайн-хакей;
б) бліцспрынт;
в) флорбол.

4. Залом - гэта...

а) гатунак буйнога тлустага селядца;
б) разважшчэнне нечага ў глыбіню;
в) перашкода пры сплаве лесу.

5. Чаму ў тыранаазаўра была дужа вялікая галава?

а) каб усе здалёк бачылі, які ён разумны;
б) каб ураўнаважваць цяжкі хвост;
в) каб нападаць на буйную здабычу.

6. У 1270 годзе ў Гародні княжыў...

а) Мсціслаў;
б) Трайдзэн;
в) Скомунд.

7. Агент Фокс Малдэр з «Сакрэтных матэрыялаў» па нацыянальнасці...

а) француз;
б) ангелец;
в) яўрэй.

8. Груца - гэта...

а) ячныя крупы;
б) грэцкая каша;
в) замёрзлы бруд на дарозе.

9. Імя індыйскай багіні разбурэння, смерці і чумы - ...

а) Улуру;
б) Калі;
в) Буве.

Правільныя адказы: 1в, 2а, 3в, 4а, 5б, 6б, 7в, 8а, 9б.

Дзевяць правільных адказаў - выдатна, 7-8 - вельмі добра, 5-6 - добра, 3-4 - здавальняюча, менш як 3 - у Вас ёсць над чым папрацаваць.

10. Яны самыя загадкавыя на планеце. Пра іх колькасць можна гаварыць толькі ў цяперашнім часе. Сёння іх дзевяць, у мінулым стагоддзі было болей. Меншыя з іх знікаюць пад вадою, а на іх месцы ўзнікаюць маленькія вулканы. Пра што размова і дзе ж такі цуд можна ўбачыць?

Адказ на дзесятае пытанне папярэдняга конкурсу (**гл. ПАГОНЮ №42 ад 8 ліпеня г.г.**): жахлівы ацтэкскі дэман меў назву Іцпапалотль.

На жаль, сярод адказаў чытачоў на гэтае пытанне правільных не было. Спадзяемся, што вам абавязкова пашанцуе гэтым разам. Дасылайце свае адказы! Прыз чакае вас!



ГАРАСКОП

♈ **Баран (21.03-20.04).** У працы - час на рэалізацыю планаў. Венера варожыць Вам вялікае каханне.

♉ **Бык (21.04-20.05).** Час на сямейныя справы. Варта высветліць апошнія непаразуменні ў шчырай размове.

♊ **Блізняты (21.05-21.06).** Будзеце ў цэнтры ўвагі. Калі захочаце пафліртаваць, то лепш гэта зрабіць з Бадалеем.

♋ **Рак (22.06-22.07).** Будзеце задаволены агульным поспехам на працы. У пачуцця́х хутка з'явіцца новае захапленне.

♌ **Леў (23.07-23.08).** Шчаслівыя дні для закаханых Львоў. Толькі б гэта не перашкаджала абавязкам на працы.

♍ **Панна (24.08-23.09).** Хтосьці прагне пазнаёміцца з Вамі. Не стаўцеся пагардліва і дазвольце запрасіць сябе на спатканне.

♎ **Шалі (24.09-23.10).** Змена эмоцыяў, але гэта вынік пары года. Сачыце за станам здароўя.

♏ **Скарпіён (24.10-22.11).** Дома апошнім часам бывае рэдка, як у гасцях. Каб знайсці паразуменне, купіце сваім каханым кветкі.

♐ **Стралец (23.11-21.12).** Падчас таварыскіх сустрэч вы можаце напаткаць сваё каханне. Магчыма, гэта будзе хтосьці з-пад знаку Шаляў.

♑ **Казярог (22.12-20.01).** Хтосьці ўплывовы прапануе Вам выгадную справу, якая прынясе грашовыя папаўненні.

♒ **Вадалей (21.01-19.02).** На працы стане больш абавязкаў. Але нічога! Справіцеся вельмі добра, таму што Вам дапаможа дзелавы і ахвяровы Леў.

♓ **Рыбы (20.02-20.03).** Сталы наплыў энергіі і сілаў. Для ўражлівых Рыбак важна ўсведамленне пра тое, што іх кахаюць.

ПАГОНЯ
Заснавальнік: культурна-асветніцкі фонд "Бацькаўшчына"

Адрас рэдакцыі: 230025, г. Гродна, вул. К. Маркса, 11. Тэл.72-37-14, 72-35-61, факс 72-29-96. E-mail: pagonia@irex.minsk.by
Падпісны індэкс: 63124.

Рэгістрацыйны нумар 597. Нумар газеты надрукаваны ў Гарадзенскай абласной узбуйненай друкарні.
Адрас: 230023, г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4.
Замова 3 446 Наклад 8 884
Нумар падпісаны да друку ў 16.00 18.08.1999 г.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні не абавязкова адлюстроўваюць погляд рэдакцыі. Якасць друку адпавядае прадастаўленым рэдакцыяй дыяпазітывам.
Аб'ём - два ўмоўныя друкарскія аркушы.

Галоўны рэдактар Мікола Маркевіч

Камп'ютарны набор: Таццяна Лучыц
камп'ютарная вёрстка: Аляксей Салей